Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 18 (432) | Нядзеля, 23 красавіка 1939 года | Цана 20 кап.

РЫХТАВАЦЦА ДА ДЭКАДЫ Ў МАСКВЕ

Рост прамысловасці і сельскай гаспадаркі Совецкай Беларусі, мудрае правядзенне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, штодзённыя клопаты, увага і кіраўніцтва комуністычнай партыі фронтам мастацтваў забяспечылі росквіт усіх мастацтваў БССР, нацыянальных па форме і соцыялістычных па зместу.

Беларускі народ вылучыў з свайго асяроддзя сотні і тысячы таленавітых людзей, якія, авалодаўшы культурай мінулага, з поспехам працуюць у галіне навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтваў, ствараючы новую, соцыялістычную культуру.

З народных гушчаў выйшлі дзесяткі і сотні таленавітых мастакоў слова, жывапісу, музыкі, кроўна звязаныя са сваім народам, узбагачаючыя народ духоўна, ствараючы вялікае мастацтва большэвізма.

Са сцэны беларускіх тэатраў загучаў магутны голас родапачынальніка пролетарскай літаратуры А. М. Горкага, класікаў рускай і сусветнай драматургіі—Астроўскага, Мальера, Шыллера, Гальдоні. На сцэне тэатраў БССР ставіліся і ставяцца п'есы совецкіх драматургаў — Трэнёва, Вішнеўскага, Пагодзіна, Іванова, Карнейчука. Цяпер беларускі тэатр дастаткова падрыхтаван для таго, каб паставіць на сцэне творы геніяльнага Шэкспіра.

Разам з ростам беларускага тэатра расла і развівалася беларуская совецкая драматургія. Вучачыся на ўзорах рускай і сусветнай драматургіі, рад пісьменнікаў Совецкай Беларусі—Якуб Колас, Крапіва, Клімковіч, Броўка, Глебка, Рамановіч і інш. з поспехам працуюць, ствараючы маладую беларускую совецкую драматургію.

Вызначаныя для паказу на дэкадзе ў Маскве п'есы «Апошнія» А. М. Горкага, «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» Крапівы, «Пагібель воўка» Самуйлёнка, «Чалавек з ружжом» Пагодзіна, «Над Бярозай-ракой» Глебкі, оперы «Міхась Падгорны»—музыка Цікоцкага, лібрэта Броўкі, «Дрыгва»—музыка Багатырова, лібрэта Рамановіча, «Кветкі шчасця»—музыка Туранкова, лібрэта Броўкі і Глебкі, балет «Салавей» Крошнера і інш. заслугоўваюць таго, каб над імі працаваць. *Але некаторыя* з гэтых спектакляў патрабуюць пераафармлення, а часам замены паасобных выканаўцаў. А паасобныя гатовыя спектаклі трэба перарабляць.

Творчыя работнікі беларускага тэатра і драматургіі ў першую чаргу вучыліся і вучацца на ўзорах рускага тэатра і драматургіі. Братні рускі народ, які пад кіраўніцтвам геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна дапамог беларускаму народу ўпершыню ў гісторыі стварыць сваю дзяржаўнасць, шмат дапамог і дапамагае ў справе стварэння беларускай совецкай культуры. І цяпер лепшыя сілы рускага мастацтва дапамагаюць у справе падрыхтоўкі беларускага совецкага мастацтва да справаздачнай дэкады ў Маскве.

Рашэнні XVIII гістарычнага з'езда комуністычнай партыі, даклад генія чалавецтва І. В. Сталіна, грандыёзная праграма трэцяй сталінскай пяцігодкі, задача перагнаць у эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны, глыбокія словы вялікага Сталіна аб інтэлігенцыі выклікалі небывалы ўздым у краіне, натхнілі наш народ, нашу соцыялістычную інтэлігенцыю на новыя поспехі ў справе пабудовы комуністычнага грамадства.

Совецкі народ, соцыялістычная інтэлігенцыя, як ніколі, моцна згрупіраваны вакол комуністычнай партыі і яе правадыра І. В. Сталіна. Нашы літаратары і мастакі плённа працуюць, ствараючы мастацтва соцыялізма.

Мастакі БССР без лішняга шуму рыхтуюцца да выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Патаемная думка кожнага з працаўнікоў фронта літаратуры і мастацтва — прыйсці да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве з новымі творамі, вартымі нашай вялікай ленінска-сталінскай эпохі.

Задачай Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР і праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР—узначаліць новы магутны ўздым работнікаў літаратуры і мастацтваў, накіроўваючы яго на далейшы рост усяго мастацтва.

Сярод лепшых творчых работнікаў літаратуры і мастацтваў наглядаецца цяга ў нашу партыю. Трэба дапамагчы ім стаць у рады бальшавікоў самай перадавой у свеце, самай рэволюцыйнай комуністычнай партыі.

На дэкаду паедуць два нашых лепшых драматычных тэатры. Задача творчых работнікаў абодвух тэатраў яшчэ і яшчэ раз прадумаць свой творчы шлях, яшчэ і яшчэ раз падумаць аб мастацкім профілі кожнага з тэатраў, каб не быць падобным адзін на другі.

Вялікая і пачэсная задача нашай марксісцка-ленінскай крытыкі — дапамагчы фронту мастацтваў БССР рыхтавацца да дэкады ў Маскве. Трэба кожны спектакль, прызначаны на дэкаду, шырока абмяркоўваць на сходах, у друку, усямерна дапамагаючы калектывам тэатраў у павышэнні якасці пастановак.

Дзейсна рыхтавацца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве!

НОВЫЯ ТВОРЫ

К. КРАПІВА

„ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ“

Сатырычная камедыя Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім» паказвае метады шкодніцкай дзейнасці ворагаў народа і іх прыспешнікаў — паклёпнікаў і кар'ерыстаў і выкрыццё іх совецкімі людзьмі.

Дзея адбываецца ў навукова-даследчым інстытуце.

Друкуем сцэну з першага акта камедыі. У сцэне ўдзельнічаюць: Горлахвацкі—дырэктар інстытута геалогіі, псеўдавучоны, Зёлкін — малодшы навуковы супрацоўнік інстытута; Зіна — жонка Зёлкіна, тэхнічны сакратар інстытута; цёця Каця — прыбіральшчыца; Нічыпар — дворнік.

Цёця Каця корпаецца ў кутку. Нячутна ўваходзіць Зёлкін. Аглядае карыдор, заўважае цёцю Кацю.

Зёлкін (зпянацку). Добры дзень, цёця Каця!

Цёця Каця (спалохана). Цьфу ты, нячысты дух! Выбачайце, таварыш Зёлкін! Гэта-ж вы так мяне спалохалі!

Зёлкін. Я-ж толькі прывітаўся.

Цёця Каця. Дзякую вам за такое вітанне! І чаму вы, гаварыш Зёлкін, ходзіце так заўсёды, быццам у вас не ногі, а мяккія лапы.

Зёлкін. Пра мае ногі вы не турбуйцеся.

Цёця Каця. Я пра сябе турбуюся, а не пра вашы ногі.

Зёлкін. Скажыце, — Аляксандр Пятровіч прышоў?

Цёця Каця. Таго, які вам трэба, няма.

Зёлкін. А які ёсць?

Цёця Каця. Чорнавус.

Зёлкін. А хто яшчэ ёсць?

Цёця Каця. Усе ёсць.

Зёлкін. Верачка прышла?

Цёця Каця. Прышла.

Зёлкін. Мусіць, першая?

Цёця Каця. Першая.

Зёлкін. Сядзела на канапе і чакала Чорнавуса?

Цёця Каця. Сядзела і чакала.

Зёлкін (падміргвае). Ці не ўтрэскалася яна?

Цёця Каця. Што мне да таго, няхай трэскаецца.

Зёлкін. Не, гэта цікава.

Цёця Каця. Вы лепш глядзіце, каб ваша жонка не ўтрэскалася.

Зёлкін. Вы за маю жонку не бойцеся, яна ў добрых руках.

Цёця Каця. У чыіх гэта?

Зёлкін. У маіх, вядома. Во, у гэтых.

Цёця Каця. Ха-ха-ха!

Зёлкін. Чаго вам смешна? Гэта нейкія непрыстойныя намёкі. Вы, калі маеце што сказаць, то скажыце проста.

Цёця Каця. Ніякіх намёкаў. Я з вашых рук смяюся, што яны такія малыя.

Зёлкін. Вы, можа, намякаеце на тое, што мая жонка ўчора з нейкім на машыне ехала? Дык гэта хлусня. Учора адвячоркам мая жонка была тут і працавала. І я прашу вас плётак не распускаць.

Цёця Каця. А я пра машыну нічога і не казала вам.

Зёлкін. Адным словам, пакінем пра гэта гаварыць. Калі даведаецца пра вашу гаворку таварыш Горлахвацкі, дык ён вас з работы прагоніць.

Цёця Каця. За што? Я-ж нічога не кажу, гэта вы самі.

Зёлкін. А пра што яны гаварылі?

Цёця Каця. Што-ж я ведаю? Машына толькі мігнулася.

Зёлкін. Ды я не пра тое. Вера з Чорнавусам што гаварылі?

Цёця Каця. А я не прыслухоўвалася.

Зёлкін. Нядобра так, цёця Каця. Мы з вамі заўсёды прыяцелямі былі.

Цёця Каця. Праўда, я добра не чула, што яны гаварылі. Пра нейкую навуковую работу гаварылі. Верачка пыталася, ці няма адказу з Масквы.

Зёлкін. Ага, дык гэта ён у Маскву паслаў ды чакае адказу. А яшчэ што? Пра дырэктара нічога не гаварылі?

Цёця Каця. Не.

Зёлкін. А пра мяне?

Цёця Каця. І пра вас нічога.

Зёлкін. Няўжо-ж яны больш нічога і не гаварылі?

Цёця Каця. Кажу-ж вам, што нічога. Толькі Туляга расказваў, як у яго на вуліцы нейкі чалавек запытаўся, ці не Падгаецкі яго прозвішча?

Зёлкін. Дык ён што? Спужаўся?

Цёця Каця. Страшэнна перапужаўся. Кажа, што быў дзенікінскі палкоўнік Падгаецкі вельмі падобны на яго.

Зёлкін. А, можа, ён і сапраўды які палкоўнік?

Цёця Каця. Хто?

Зёлкін. Туляга.

Цёця Каця. Ды кіньце вы. Я-ж яго ведаю яшчэ да таго, як ён у Варонеж выехаў быў. Ён і ў войску не быў ніколі.

Зёлкін (заняты нейкімі сваімі думкамі). Цікава, цікава... Вы мне, цёця Каця, заўсёды расказвайце што-небудзь такое... свеженькае. Я вельмі люблю слухаць. (Адыходзіць).

Цёця Каця (адна). Бач, ласы які да бабскіх плётак. У самога вушы вялікія, хадзі ды і выслухоўвай.

Уваходзіць Нічыпар.

Нічыпар. Ідзе.

Цёця Каця. Няхай ідзе.

Нічыпар. Я зайшоў, каб часам беспарадку ў цябе якога не было.

Цёця Каця. А які ў мяне беспарадак можа быць? Падмецена, выцерта... Чаго яшчэ трэба?

Нічыпар. Ды ты баба спраўная. Ну, я пайшоў...

Уваходзіць Горлахвацкі. Знімае паліто і капялюш і аддае цёці Каці.

Горлахвацкі. Як жывём, цёця Каця?

Цёця Каця. Нічога, жывём памаленьку.

Горлахвацкі. Чаму памаленьку?

Цёця Каця. Ну, так гаворыцца.

Горлахвацкі. Трэба шпарка жыць.

Цёця Каця. А як гэта шпарка?

Горлахвацкі. А так, каб аж вецер свістаў ля вушэй. Працаваць трэба заўзята. Вось як я, напрыклад, — адпачыць хвіліну часу няма.

Цёця Каця (у бок). Спрацаваўся, бедны! (Горлахвацкаму). Ну, учора-ж, мусіць, адпачылі крыху?

Горлахвацкі. Адкуль вы ведаеце?

Цёця Каця. Бачыла, як вы з жонкай за горад ехалі на машыне.

Горлахвацкі. Жонка сілай ад стала адарвала, каб крыху праветрыўся.

Цёця Каця. Мне здавалася раней, што ваша жонка чарнявая, адно-ж яна бландынка.

Горлахвацкі (збянтэжана). Бландынка? Як бландынка?

Цёця Каця. Ну, бландынка, я-ж бачыла ўчора.

Горлахвацкі. А, можа, і праўда — бландынка. Значыць яна гэтае самае... (круціць рукой каля валасоў) пабландынілася, а я і не заўважыў. (Рагоча). Так улёг у работу, што нават не заўважыў, калі жонка валасы пафарбавала. Аж смешна! (Рагоча).

Цёця Каця. Сапраўды смешна. Вы думалі чорныя, а яны светлыя, як у нашай Зіначкі. (Рагочуць абодва).

Горлахвацкі. Вы толькі не кажыце нікому, што я валасы жанчыны пераблытаў, а то смяяцца будуць.

Цёця Каця. А мне што? Блытайце сабе.

Горлахвацкі (супакоіўшыся). Па-мойму, цёця Каця, вы лішнюю плошчу падмятаеце... звыш нормы.

Цёця Каця. Няхай-бы памералі, можа і лішняя.

Горлахвацкі. І не мераючы відаць. Напішыце маленькую заяўку, а я наладжу рэзалюцыю, каб вам прыбавілі зарплаты.

Цёця Каця. Дзякую... Я за сакрэты грошай не бяру.

Горлахвацкі. Вось як! (Мацае ў кішэнях). А папяросы забыўся. Як-жа я працаваць буду?.. Цёця Каця, вось вам грошы, прынясіце мне дзве пачкі папярос.

Цёця Каця. Добра. (Бярэ грошы і выходзіць).

Горлахвацкі (прычэсваецца перад люстэркам). Ну, і шэльма баба! Так адсекла!

Уваходзіць чалавек у форме НКВД.

Чалавек у форме. Скажыце, як мне пабачыць Таню Пракаповіч?

Горлахвацкі. Таню Пракаповіч? А хто яна такая?

Чалавек у форме. Мая сястра. Перадайце ёй, калі ласка, што брат з раёна прыехаў, — няхай яна сюды выйдзе.

Горлахвацкі. У нас такой няма.

Чалавек у форме. Чакайце... Гэта-ж інстытут біялогіі?

Горлахвацкі. Вы памыліліся: гэта інстытут геалогіі, а інстытут біялогіі знаходзіцца на Шырокай вуліцы. Нумар дома я вам не магу сказаць.

У адных дзвярах паказваецца галава Зёлкіна.

Чалавек у форме. Значыць, на Шырокай? Ну, дзякую, цяпер я ўжо знайду. (Выходзіць).

Зёлкін (падыходзіць да Горлахвацкага). Чаго ён прыходзіў?

Горлахвацкі (як-бы нехаця). Цікавіцца некаторымі асобамі.

Зёлкін. Кім, калі не сакрэт?

Горлахвацкі. Не толькі сакрэт, а дзяржаўная тайна. (Ідзе ў свой габінет).

Зёлкін (адзін). За каго-ж гэта бярупца?.. Называлася Шырокая вуліца... Хто-ж там жыве з нашых? (Наморшчыўшы лоб, стараецца прыпомніць, потым дастае з кішэні блок-нот і паспешна гартае. Чытае). Аляксандр Пятровіч Чорнавус — Шырокая, 23. Вось табе і выдатны вучоны! Даскакаўся, галубок! (Да цёці Каці, што ўвайшла з папяросамі). Цёця Каця, чулі навіну?

Цёця Каця. Не, не чула. А што такое?

Зёлкін. Не можна казаць.

Цёця Каця. Дальбог, я нікому не скажу.

Зёлкін (аглядзеўшыся кругом, шэпча). Нашага Чорнавуса... (Далей шэпча ў самае вуха). Прыходзілі нядаўна.

Цёця Каця (здзіўлена). Што вы кажаце?

Зёлкін. Маўчок. Пра гэта ведаю толькі я ды яшчэ адзін чалавек.

Цёця Каця. А-я-яй! Хто-ж бы гэта мог падумаць! Гэтакі, здаецца, чалавек! Проста аж не верыцца. (Ідзе з папяросамі ў габінет дырэктара).

Зёлкін (адзін, бярэ тэлефонную трубку). Пеця?.. Ты яшчэ нічога не чуў пра нашага Чорнавуса?.. Амба... Яшчэ не, але сёння ці заўтра — напэўна. Ага, пыталіся адрасу. Гэта, пакуль-што, паміж намі... Бывай. (Набірае другі нумар). Саша, гэта ты? Скажу табе навіну... Наш Чорнавус пляснуўся... Не, ён яшчэ на рабоце, але ўжо ўсёроўна... Каб не ведаў, дык-бы не гаварыў. (Вешае трубку. Прычыняе адны дзверы, што выходзяць у карыдор). Зіна! Выйдзі сюды на хвіліну! (Выходзіць Зіна). Ты дзе гэта была ўчора з Горлахвацкім?

Зіна. Ты-ж ведаеш дзе.

Зёлкін. Я-то ведаю... На аўтамабілі раскатвалася...

Зіна. Хто табе сказаў?

Зёлкін. Той, хто бачыў.

Зіна. Глупства! Бабскія плёткі.

Зёлкін. Зінка, помні! Калі што якое, дык я цябе задушу вось гэтымі сваімі рукамі. Я зараз-жа пайду да Горлахвацкага і зраблю скандал. (Накіроўваецца да дзвярэй дырэктара).

Зіна. Пайдзі, пайдзі, ён табе ўстроіць, што і з работы паляціш.

Зёлкін (спыняецца). Хацеў табе сказаць навіну цікавую, але калі ты такая — не скажу.

Зіна. Зёлачка, скажы, міленькі.

Зёлкін. Дзяржаўная тайна.

Зіна. Магіла, — нікому не скажу.

Зёлкін. Нашага Чорнавуса... (Аглядаецца кругом і шэпча на вуха).

Зіна (робіць вялікія вочы). Ну!?

Зёлкін. Гэта ведаю толькі я і яшчэ адзін чалавек.

Зіна. Ай! Трэба-ж Лідзе пазваніць. Яна з Чорнавусавай дачкой дружыць.

Зёлкін (каб чула Зіна). А Горлахвацкаму я ўсё-такі зраблю скандал. (Нібы накіроўваецца да дзвярэй габінета).

Зіна (махае рукой). Ідзі, ідзі! Я пагляджу, як ты пробкай будзеш вылятаць адтуль.

Далей дзея працягваецца ў габінеце Горлахвацкага.

Горлахвацкі (закурыўшы папяросу, гаворыць да цёці Каці, якая трымаецца за ручку дзвярэй). Вы мне што-небудзь сказаць хочаце, цёця Каця?

Цёця Каця. Я хацела запытацца, ды не адважуся.

Горлахвацкі. Пра што-ж вы хацелі запытацца?

Цёця Каця. Ці праўда гэта, Аляксандр Пятровіч, што пра нашага Чорнавуса гавораць?

Горлахвацкі. А што пра яго гавораць?

Цёця Каця. Ну... вы-ж ведаеце. Кажуць, што яго хутка ў нас не будзе...

Горлахвацкі. А хто вам казаў?

Цёця Каця. Таварыш Зёлкін. Кажа, ўжо прыходзілі па яго.

Горлахвацкі. Зёлкін? (Пауза. Падумаў). Мусіць, ён ведае, калі казаў.

Цёця Каця. Вы-ж лепш ведаеце?

Горлахвацкі. Каб я што і ведаў, дык вам-бы не сказаў. Пра гэта гаварыць не можна.

Цёця Каця. Ага, дык-такі праўда. (Выходзіць).

Горлахвацкі (адзін). Пайшло пісаць. (Пауза). Гэта мне якраз на-руку. Цікава панаглядаць, як гэты шаноўны вучоны трапятацца будзе. (Устаў, прайшоўся па пакоі, падышоў да стала, узяў у рукі адну з костак мамонта). Маслы праклятыя! Што я з вамі рабіць буду? Дажыўся, таварыш Горлахвацкі, няма чаго сказаць! Косткамі абклаўся, палеантолагам стаў! А быў-жа ледзь не намеснікам наркома. Горлахвацкаму банкеты, Горлахвацкаму авацыі, Горлахвацкі мог любога ў барановы рог скруціць. І раптам — косткі! Скруці яе праклятую, калі хочаш. Запхнулі мяне прыяцелі ў гэту дзюру! Далей ад небяспекі... І спецыяльнасць такую ўдружылі, з якой нікуды не паткнешся,—палеанталогія. Гэта значыць, сядзі Горлахвацкі і не рыпайся, а то можаш і нас асканд́аліць. Сядзі ціха, а калі спатрэбішся — пазавём! Сядзець-то тут зацішна... Можаш сто год прасядзець над гэтымі косткамі, ніхто цябе не патрывожыць. Але Горлахвацкі сядзець не прывык, — вось у чым уся бяда. (Стук у дзверы). Што-ж, зробім выгляд, што мы займаемся навуковай працай. (Раскладае на стале косці, разгортвае кнігі і садзіцца за стол).

Уваходзіць Зёлкін.

Зёлкін. Выбачайце, Аляксандр Пятровіч, што я вам думаць перашкодзіў.

Горлахвацкі (нібы з намаганнем адрываецца ад работы). Я вас слухаю, таварыш Зёлкін.

Зёлкін. Праваронілі, Аляксандр Пятровіч! Ах, як мы праваронілі! Нам даўно трэба было яго прашчупаць.

Горлахвацкі. Выбачайце, я нешта не разумею... Што праваронілі? Каго прашчупаць?

Зёлкін. Вы мяне добра разумееце, Аляксандр Пятровіч, і ведаеце, пра каго я гавару. Ад мяне цяжка схаваць што-небудзь. Досыць мне было пачуць адно слова, як я адразу здагадаўся, пра каго ідзе гаворка.

Горлахвацкі. Я вам нічога не гаварыў.

Зёлкін. Мне і гаварыць нічога не трэба. Я і так усё ведаю.

Горлахвацкі. Давайце пакінем пра гэта.

Зёлкін. Давайце пакінем, але прыняць нейкія меры трэба. У Маскву-ж паслаў нейкую сваю працу. Чакае адказу, а таго не ведае, што зараз яму дадуць адказ... Трэба было-б вывавецтва папярэдзіць і на геафак пазваніць. Там-жа яшчэ нічога не ведаюць. А я ўпэўнен, што яго кніга шкодніцкая.

Горлахвацкі. І вы гэта можаце даказаць?

Зёлкін. Дарэмна вы яго шкадуеце, Аляксандр Пятровіч. Паверце, што ён вам не вялікі прыяцель. Каб вы ведалі, што ён пра вас гаворыць!

Горлахвацкі. Няхай гаворыць, я помсціцца не збіраюся.

Зёлкін. Тулягу, як вучонага, ён ставіць вышэй вас.

Горлахвацкі. Што-ж, можа гэты Туляга і сапраўды вялікія веды мае.

Зёлкін. Веды-то ён мае, але што за карысць? За ўсё жыццё ніводнага радка не надрукаваў. Баіцца. Усяго ён баіцца. Хоўдзіць і калоціцца. Кажуць, што ён быў у Дзенікіна палкоўнікам.

Горлахвацкі. Ну, дзе ўжо яму!

Зёлкін. Праўда, праўда. Сёння на вуліцы адзін чалавек пазнаў яго, дык ён цяпер ні жывы, ні мёртвы ходзіць.

Горлахвацкі (смяецца). Баязлівы ён, гэта праўда. Палкоўнік! Ха-ха-ха!

„ВАЙНА ПАЧЫНАЕЦЦА“

Кіеўская студыя «Украінфільм» закончыла здыманне кінофільма «Вайна пачынаецца». Рэжысёр А. М. Ромм. **На здымку** — кадр з фільма: камандзір і камісар авіябрыгады чытаюць баявы загад.
Фотахроніка ТАСС.

Якуб КОЛАС

МОЙ ДОМ

Між ніў дарожкаю сляпою
Іду я мернаю ступою
І разглядаюся кругом.
Пад ясна-сіняю страхою
Чыёюсь дбалаю рукою
Збудован мне прасторны дом.

Утульна ў ім, дабра ў ім поўна,
І ўсюды мудрасці бязмоўнай
Відна спрадвечная пячаць.
На ветравеях, нібы воўна,
Плывуць хмурынкі так чароўна,
Чаго плывуць? Куды? — маўчаць.

Унь там рачулка срэбрам літым
Бяжыць па жолабе размытым
І цэлы свет жыцця нясе.
А луг зялёным аксамітам,
Вянкамі кветак апавіты,
Разлёгся ў роскашы-красе.

Дубы, сябры маёй самоты,
У высі неба мкнуць узлёты,
Сукі раскінуўшы вакол.
А колькі згоды і пяшчоты
У тых пясках, што пазалотай
Ускрай баркоў ляглі на дол!

Як многа волі і разгону!
Як многа песень, шуму, звону,
Дзе ні паслухай, ні зірні!
Свае тут звычаі, законы,
У кожнай песні свае тоны
І свой адбітак глыбіні.

Іду я, дом свой аглядаю
Ды сам з сабою размаўляю.
А на душы такі спакой!
І песня нейкая жывая
У дружны тон адзін спявае
І з гэтым небам, і з зямлёй.

13. IV-39.

ЗАЦВЯРДЖЭННЕ ЭСКІЗАЎ РАБОТ ДЛЯ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАЎКІ

Да адкрыцця мастацкай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» засталося часу адзін год. Час невялікі, калі прыняць пад увагу, што нашым мастакам прадстаіць выканаць для гэтай выстаўкі выключна складаныя і адказныя па тэматыцы работы.

Да 10 красавіка мастакі і скульптары павінны былі прадставіць эскізы сваіх карцін і скульптур. Да 18 красавіка мастацкім советам выстаўкі зацверджана толькі 19 эскізаў. Праўда, якасць гэтых першых эскізаў досыць высокая, але-ж пакуль-што зацверджана толькі 19 з 85 эскізаў, падлягаючых зацвярджэнню. Гэта выклікае трывогу за своечасовасць выканання работ мастакамі.

12 красавіка мастацкі совет разгледзеў і зацвердзіў эскізы жывапісцаў Е. Е. Красоўскага, З. І. Мірынгофа, А. Б. Заборава, Л. Рана і скульптара С. А. Ангалевіча.

Разуменне гістарычнай тэмы мы знаходзім у эскізах Красоўскага — «Сталін у штабе Рэўваенсовета Заходняга фронта» і Мірынгофа—«Дэлегацыя салдат Заходняга фронта ў М. В. Фрунзе». Праўда, у гэтых эскізах яшчэ не знойдзен жаданы лаканізм кампазіцыі і чоткасць зместу, але гэтыя недахопы могуць быць знішчаны ў далейшай рабоце.

Трэба адзначыць замкнутасць мастацкага совета выстаўкі. Узятая мастацкім советам установка на тое, каб эскізы разглядаліся і зацвярджаліся толькі членамі совета, на нашу думку, — няправільная. Да абмеркавання і зацвярджэння эскізаў мастацкі совет павінен прыцягнуць шырокую грамадскасць, мастакоў, работнікаў іншых галін мастацтваў.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб забяспечыць маладых беларускіх мастакоў аўтарытэтнай кансультацыяй вядучых мастакоў Совецкага Саюза.

Упраўленне па справах мастацтваў пры Соўнаркоме БССР, выстаўком, мастацкі совет і самі мастакі павінны прыняць захады к таму, каб усямерна фарсіраваць падрыхтоўку мастацкай выстаўкі 1940 года.

А. ДАЛІН.

З зацверджаных эскізаў. «Орджанікідзе ў разведцы» — скульптурная група А. Жорава. Фота І. Каплінскага.

Агульнагарадскі шолам-алэйхемаўскі вечар

16 красавіка ў Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры Беларусі адбыўся агульнагарадскі вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння вялікага яўрэйскага пісьменніка Шолам-Алэйхема.

Стаханаўцы менскіх прадпрыемстваў, прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі сталіцы, студэнты вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў прышлі на вечар, каб ушанаваць памяць геніяльнага пісьменніка-гуманіста, выказаць павагу совецкага чытача да выдатнага класіка яўрэйскай літаратуры. Ва ўступным слове старшыні Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР Міхася Лынькова, у дакладзе А. Кучара, у прамове пісьменніка-ордэнаносца Зм. Бядулі, у выступленнях яўрэйскіх пісьменнікаў і паэтаў З. Аксельрода, Л. Талалая, М. Груб'яна, С. Каган, Х. Мальцінскага, А. Платнера, Э. Кагана адлюстравана любоў, замілаванне, павага совецкага народа да Шолам-Алэйхема і яго вялікай спадчыны.

Удзельнікі вечара з вялікім уздымам, пры бурнай авацыі прысутных, прынялі тэкст прывітальнага пісьма правадыру народаў таварышу Сталіну.

Вечар закончыўся інсцэніроўкай Яўрэйскага тэатра на тэму: «Шолам-Алэйхем сярод сваіх герояў».

Я.

18 красавіка споўнілася 100 год работы на сцэне Маскоўскага Малага тэатра артыстычнай сям'і Садоўскіх. Прадстаўнік трэцяга пакалення Садоўскіх — Проў Міхайлавіч Садоўскі — адзін з любімейшых совецкіх актораў.

На здымку: Нар. арт. СССР ордэнаносец П. М. Садоўскі ў артыстычным пакоі перад рэпетыцыяй.

Фотахроніка ТАСС.

Нарада пачынаючых пісьменнікаў Гомеля

18 красавіка пры рэдакцыі газеты «Гомельская праўда» адбылася нарада пачынаючых пісьменнікаў і паэтаў гор. Гомеля. Загадчык кафедры літаратуры Педагагічнага інстытута тав. Кушнер зрабіў на нарадзе агляд творчасці пачынаючага паэта Д. Кавалёва.

Маладому паэту Д. Кавалёву ўказана на рад буйных недахопаў у яго творах: пагоня за «навізной» і «свежасцю» тэмы і няўважлівыя адносіны да яе мастацкага вырашэння, штамп, расцягнутасць паасобных дэталей і цэлых вершаў.

Абмяняўшыся думкамі аб творах Д. Кавалёва, прысутныя падвергнулі крытыцы рэдакцыю газеты «Гомельская праўда» за слабую работу з маладымі аўтарамі.

Удзельнікі нарады ўзнялі пытанне аб неабходнасці мець у рэдакцыі газеты «Гомельская праўда» кваліфіцыраванага літаратурнага кансультанта.

М. Г.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ТВАРЫЦЬ У ГОНАР І СЛАВУ КОМУНІЗМА

ДАКЛАД тав. М. Ц. ЛЫНЬКОВА НА ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ У САЮЗЕ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

14 красавіка адбыўся сход партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. З дакладам аб выніках XVIII з'езда ВКП(б) выступіў тав. М. Ц. Лынькоў.

— XVIII з'езд Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большавікоў), — гаворыць дакладчык, — прыкаваў да сябе ўвагу ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва. Вялікі правадыр народаў таварыш Сталін сваім дакладам на з'ездзе ўзброіў нашу партыю, совецкі народ і працоўных усяго свету геніяльным па сваёй глыбіні і празорлівасці аналізам сучаснага міжнароднага становішча. Правадыр паказаў усім народам сапраўдны твар тых, хто ўцягнуў чалавецтва ў другую імперыялістычную вайну, ён сарваў маску з такзваных «міратворцаў», якія ўсімі сіламі патураюць фашысцкаму разбою. З вялікім здавальненнем сустрэў совецкі народ словы таварыша Сталіна аб тым, што, адстойваючы справу міру і падтрымліваючы добрасуседскія адносіны з тымі краінамі, якія хочуць жыць у міры з намі, совецкі народ адкажа двайным ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны, калі яны пасмеюць напасці на нашу радзіму.

Далей тав. Лынькоў падрабязна гаворыць аб тых вялікіх задачах, якія паставіў таварыш Сталін перад партыяй і народам у сваім гістарычным дакладзе, аб выключным значэнні сталінскага вызначэння ролі дзяржавы ў перыяд пераходу ад соцыялізма к комунізму і ў комуністычным грамадстве, якое жыве ў капіталістычным акружэнні.

Для пабудовы комунізма перад Совецкім Саюзам, — кажа тав. Лынькоў, — таварышам Сталіным пастаўлена задача перагнаць не толькі тэхнічна, але і эканамічна самыя перадавыя краіны свету. Адной з самых галоўных умоў для выканання велізарных планаў далейшага ўмацавання эканамічнай, палітычнай і абароннай магутнасці нашай радзімы з'яўляецца комуністычнае выхаванне мас, ліквідацыя перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей, павышэнне ведаў рабочага класа да ўзроўню ведаў інжынерна-тэхнічнага персанала. Соцыялістычная інтэлігенцыя, аб якой так цёпла і любоўна гаварыў таварыш Сталін, прызвана дапамагчы партыі ўзняць комуністычную свядомасць і культурнасць усяго народа.

Затым тав. Лынькоў гаворыць аб задачах, якія ставяць перад пісьменнікам рашэнні XVIII з'езда ВКП(б). Гэтыя задачы зводзяцца к павышэнню ідэйнага і мастацкага ўзроўню нашай літаратуры. Мы павінны стварыць такія творы аб нашай рэчаіснасці, аб людзях нашай радзімы, аб будучым комуністычным грамадстве, якія застануцца ў вяках помнікам гераічнай сталінскай эпохі. Трэба клапатліва выяўляць новыя кадры пісьменніцкай моладзі, ствараць ім усе ўмовы для паспяховай творчай работы. Справа гонару літаратараў-комуністаў паказаць усім пісьменнікам прыклад у стварэнні твораў аб рабочых і калгасніках Беларусі, аб нашай інтэлігенцыі, аб інтэрнацыянальных пачуццях совецкага народа і яго салідарнасць з народамі, якія адстойваюць сваю незалежнасць ад фашысцкіх агрэсараў. Асабліва падкрэслівае тав. Лынькоў ролю крытыкі ў ідэйным і творчым выхаванні пісьменнікаў, у правільным напраўленні іх работы.

Закончыў свой даклад тав. Лынькоў выражэннем упэўненасці, што пісьменнікі Беларусі з гонарам выканаюць свой доўг перад радзімай і партыяй у справе комуністычнага выхавання мас, у справе далейшага ўздыму культуры нашага народа.

* * *

Выступаўшыя ў спрэчках па дакладу тав. Лынькова гаварылі аб вялікім гістарычным значэнні XVIII з'езда ВКП(б) і яго рашэнняў, аб пачэснай і ўдзячнай ролі совецкай інтэлігенцыі ў будаўніцтве комунізма.

Першай выступіла тав. Эдзі Агняцвет. Яна гаварыла аб мудрасці сталінскага даклада, сталінскага вызначэння ролі інтэлігенцыі, аб геніяльным закліку таварыша Сталіна спалучаць нашы старыя і маладыя кадры ў адзіным аркестры плённай творчай працы на карысць комунізма, навучаць нашы кадры адчуванню таго новага, што адбываецца кожны дзень у жыцці краіны, народа.

Выступленне тав. Модэля было прысвечана задачам крытыкі ў справе далейшага ўздыму літаратуры і мастацтва. Гаворачы аб адставанні крытыкі, тав. Модэль выказвае думку, што гэтаму ўчастку ў нас яшчэ не ўдзяляюць дастатковай увагі. Час ужо, — прадаўжае тав. Модэль, — пакончыць з размовамі аб тым, што кадры крытыкаў складаюцца з двух-трох манапалістаў, якія адны толькі могуць даць пісьменніку ацэнку яго твора. У Акадэміі навук, у навучальных установах, сярод падрастаючай пісьменніцкай моладзі ёсць здольныя і таленавітыя крытыкі, якіх мы чамусьці не бярэм у разлік.

Тав. Гурскі гаворыць аб абавязку пісьменнікаў больш распрацоўваць абаронную тэматыку, кожным творам умацоўваць і развіваць совецкі патрыятызм, памятаючы аб тым, што мы жывём і будуем комуністычнае грамадства ў капіталістычным акружэнні.

Спрэчкі па дакладу тав. Лынькова прайшлі на высокім ідэйным узроўні, пры вялікай актыўнасці ўсіх комуністаў.

Я. Г.

ПАЭТ-ОРДЭНАНОСЕЦ П. БРОЎКА ПРЫНЯТ У ПАРТЫЮ

Днямі адбыўся адкрыты сход партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Пры вялікай актыўнасці комуністаў і прысутнічаўшых на сходзе пісьменнікаў і супрацоўнікаў ССПБ былі абмеркаваны заявы тт. Пятруся Броўкі і Аляксандра Есакова аб прыёме іх у кандыдаты партыі і заява тав. Левіна аб пераводзе яго з кандыдатаў у члены ВКП(б). У абмеркаванні заяў гэтых таварышоў прынялі ўдзел пісьменнікі Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Кандрат Крапіва, Алесь Кучар, Зэлік Аксельрод, М. Лынькоў, І. Гурскі і інш.

Пастановай партыйнага схода кандыдат партыі тав. Левін прынят у члены ВКП(б). Паэт-ордэнаносец Пятрусь Броўка і малады крытык Аляксандр Есакоў аднагалосна прыняты ў кандыдаты ў члены ВКП(б).

ЛЕКЦЫІ ДЛЯ МАСТАКОЎ

У дапамогу вывучаючым матэрыялы XVIII з'езда ВКП(б) праўленне Саюза мастакоў БССР праводзіць цыкл лекцый. 16 красавіка была праведзена першая лекцыя аб міжнародным становішчы. 20 красавіка адбылася другая лекцыя на тэму аб комуністычным выхаванні мас. Трэцяя лекцыя будзе прысвечана ролі совецкай інтэлігенцыі ў святле матэрыялаў XVIII з'езда партыі.

25 красавіка адбудзецца агульны сход мастакоў, прысвечаны вынікам XVIII з'езда ВКП(б) і творчым задачам Саюза мастакоў у адпаведнасці з пытаннямі, узнятымі на старонках «Праўды» А. Фадзеевым і Н. Віртой.

«Ленін у 1918 годзе». Кадры з фільма. Злева — выздараўленне В. І. Леніна. Ленін — нар. арт. СССР Б. В. Шчукін, урач — засл. арт. РСФСР І. М. Талчанаў. Справа — Я. М. Свердлоў разбірае карэспандэнцыю В. І. Леніна. Свердлоў — ордэнаносец арт. Л. С. Любашэўскі, Бабылёў (сакратар Леніна) — арт. С. П. Казмінскі. Фотахроніка ТАСС.

„ЛЕНІН У 1918 ГОДЗЕ“

Гэты фільм пакідае незабыўнае ўражанне. Убачыўшы яго раз, хочацца глядзець яшчэ і яшчэ. І з кожным новым праглядам усё больш усведамляеш падзеі, з велізарным хваляваннем перажываеш іх, усё глыбей і глыбей у памяць уваходзяць майстэрска створаныя жывыя чалавечыя характары і вобразы фільма.

Толькі смелае пранікненне ў рэчаіснасць, праўдзівы паказ гісторыі гераічнага совецкага народа, натхнёная творчасць нашых мастакоў змаглі забяспечыць стварэнне такога шэдэўра мастацтва.

Фільм «Ленін у 1918 годзе» раскрывае адзін са складанейшых і найцяжэйшых перыядаў жыцця совецкага народа, барацьбы большэвіцкай партыі. Гэта — перыяд інтэрвенцыі і блакады, рашучых баёў за Совецкую рэспубліку, — перыяд поўны драматычных падзей. У гэты час подлыя здраднікі, ворагі партыі і совецкага народа крывавымі змовамі і тэрорам імкнуліся нанесці ўдар у сэрца партыі, у сэрца маладой совецкай краіны. Здрадніцкай куляй з-за вугла быў забіт у Петраградзе Урыцкі. Прадажныя лакеі імперыялізма, трацкісцка-бухарынскія агенты зрабілі замах на жыццё Леніна. Але гэтай гнуснай своры не ўдалося здзейсніць свайго замыслу — задушыць рэвалюцыю, бо партыя і рабочы клас, натхнёныя і згуртаваныя геніем Леніна і Сталіна, у вялікім парыве гневу і нянавісці змялі з совецкай зямлі інтэрвенцкія орды, ушчэнт разбілі крывавыя намеры ворагаў.

З першых-жа кадраў фільма мы ўсхвалявана сочым за падзеямі, у цэнтры якіх — правадыр соцыялістычнай рэвалюцыі В. І. Ленін. Яго велічны вобраз праходзіць праз увесь фільм. Народны артыст СССР Б. Шчукін, узяўшы ўсё лепшае з папярэдняй сваёй работы над роляю Леніна, дасягнуў сапраўднага мастацкага сінтэзу, узняўся да новых вышынь у стварэнні найскладанага вобраза чалавека, мысліцеля і правадыра. Такія эпізоды, як Ленін на заводзе Міхельсона, сустрэча са Сталіным, задушэўныя гутаркі з А. М. Горкім, з Васілієм і рабочым Корабавым, — з надзвычайным майстэрствам праведзеныя Шчукіным, сваёй жыццёвай праўдзівасцю адпавядаюць таму вобразу Ільіча, які жыве ў мыслях і сэрцах нашага народа.

Калі ў «Ленін у Кастрычніку» Шчукін ішоў больш ад знешняй перадачы, падкрэсліваючы позу, жэст, дык у гэтым фільме Ленін устае перад намі ва ўсёй сваёй унутранай складанасці. Калі ў папярэднім фільме артыст як-бы свядома пазбягаў сустрэчы сам-на-сам з гледачом, дык у «Ленін у 1918 годзе» Шчукін рашуча адкінуў апасенні, што вобраз Леніна можа нібыта страціць сваю веліч пры паказе яго ў рэальна-бытавой абстаноўцы. Артыст красамоўна паказаў, што поспех творчага рэзультата іменна ў тым, каб усюды, у любых абставінах узнімацца да сутнасці вобраза, да разумення яго ўнутранага ідэйнага і душэўнага свету. І вельмі паказальна, як Шчукін ад бытавой, здавалася-б на першы погляд, выпадковай дэталі падыходзіць да шырокіх абагульненняў, прымушае гучаць на поўны голас усю складанейшую гамму сваіх пачуццёвых кантрастаў.

З надзвычайнай сілай раскрывае фільм рысы Леніна — вялікага пролетарскага гуманіста, Леніна — правадыра і друга працоўных. Раскрыццё гэтых якасцей правадыра з'яўляецца асновай работы Б. Шчукіна, асновай усяго фільма.

Артыст М. Гелавані ў гэтым фільме паспяхова прадаўжае выдатную работу па распрацоўцы вобраза І. В. Сталіна. Проста і пераканаўча раскрывае Гелавані вялікую волю, мужнасць, празорлівасць, талент палкаводца, арганізатара мас, правадыра. Артыст правільна падышоў да раскрыцця вялікай дружбы Леніна і Сталіна. І тое, чаго дасягнуў Гелавані ў гэтым фільме, з'яўляецца выдатнай асновай далейшай распрацоўкі вобраза найвялікшага генія чалавецтва.

Упершыню ў кіно так ярка і выразна паказан незабыўны вобраз рыцара рэвалюцыі Фелікса Эдмундавіча Дзержынскага. Артыст В. Маркаў вельмі праўдзіва перадае асноўныя рысы Дзержынскага — чалавечую абаяльнасць, вялікую сілу волі, гарачую нянавісць і бязлітаснасць да ворагаў, беззаветнае служэнне справе рэвалюцыі. Эпізод выкрыцця Дзержынскім здрадніка Сінцова з асаблівай сілай раскрывае рысы большэвіка, мужнага змагара за рэвалюцыю. З выключным майстэрствам, з глыбокім пранікненнем у характар жалезнага Фелікса праводзіць артыст Маркаў гэту сцэну.

Радуе паспяхова пачатая распрацоўка ў кінематаграфіі вобразаў верных саратнікаў Леніна і Сталіна — Я. М. Свердлова (арт. Л. Любашэўскі) і К. Е. Варашылава (арт. Н. Багалюбаў).

У ролі Аляксея Максімавіча Горкага засл. арт. рэсп. Н. Чэркасаў дасягнуў у фільме значных творчых удач. Праўда, яшчэ прыкметна няўпэўненасць і некаторая павярхоўнасць у рабоце актора. Зрабіўшы многае ў паказе знешняга вобліку Аляксея Максімавіча, у далейшай рабоце Н. Чэркасаў павінен знайсці сродкі для ўсебаковага раскрыцця рыс характару.

Вялікая эмацыянальная сіла фільма ў тым, што сюжэт яго пабудаван на шырокім ахопе падзей, на раскрыцці адзінства правадыроў рэвалюцыі з народам, на паказе згуртаванасці народа вакол большэвіцкай партыі.

Іменна дзякуючы чоткаму вырашэнню сваёй асноўнай тэмы — паказу ўсёперамагаючай сілы адзінства правадыроў з народам — фільм дасягае вялікіх мастацкіх абагульненняў, праўдзіва раскрывае старонкі гісторыі партыі, гісторыі нашай радзімы.

Прадстаўнікі рабочага класа — Васілій, камендант Крэмля Матвееў, рабочы Корабаў з надзвычайнай выразнасцю ўвасабляюць лепшыя рысы народа—яго веру ў перамогу рэвалюцыі, яго нязломную сілу, яго любоў і бязмежную адданасць сваім правадырам.

Глядач горача палюбіў Васілія ў выкананні Н. Охлопкава яшчэ ў фільме «Ленін у Кастрычніку». У фільме «Ленін у 1918 годзе» Охлопкаў прадаўжае выдатную рэалістычную трактоўку вобраза, узбагачае характар героя новымі фарбамі, стварае з прэдзельнай яркасцю хвалюючы збіральны вобраз рабочага-большэвіка. Васілій — тыповы вобраз адданага патрыёта радзімы, таму ён так любім нашым гледачом, так блізак яму.

Гэтыя-ж рысы народнага героя, патрыёта, уласцівы і другому выдатнаму вобразу — каменданту Крэмля Матвееву. Засл. арт. рэсп. В. Ванін скупымі, але бліскучымі па сіле выразіцельнасці сродкамі вырашыў найскладаную задачу дасканалага раскрыцця вобраза ў своеасаблівых умовах яго развіцця ў фільме.

Вялікая пераканальнасць і сіла фільма яшчэ і ў тым, што ён перадаў суровую праўду жыцця, паказаў цяжкасці барацьбы партыі і совецкага народа супроць шматлікіх унутраных і знешніх ворагаў. Ворагі совецкай дзяржавы, ворагі партыі — подлыя трацкісцка-бухарынскія вырадкі, рэшткі разбітай контррэволюцыі паказаны ва ўсім сваім каварным і агідным абліччы, без лакіроўкі і прыніжэння. Гэта выхоўвае пачуццё свяшчэннай нянавісці да ворагаў, пачуццё большэвіцкай пільнасці.

Вельмі складаную, цяжкую, але ўдзячную задачу бліскуча вырашылі стварэннем гэтага выдатнага патрыятычнага фільма сцэнарысты А. Каплер і Т. Златагорава, таленавіты майстар совецкага кіно рэжысёр М. Ромм, аператар Б. Валчок і ўвесь творчы калектыў.

Фільм «Ленін у 1918 годзе» — гэта сапраўдны твор страснага большэвіцкага, соцыялістычнага мастацтва. Ён з'яўляецца неацанімым жывым дапаможнікам у справе вывучэння гераічнай гісторыі партыі Леніна — Сталіна. Гэты фільм будзе натхняць гледача, адыграе вялікае значэнне ў справе комуністычнага выхавання працоўных.

Стварэнне фільма «Ленін у 1918 годзе» узнімае і ўзбагачае наша мастацтва, паказваючы ўсім совецкім мастакам прыклад сапраўднага творчага дзярзання і смеласці, прыклад сапраўднага майстэрства.

Ц. КРЫСЬКО, Ю. РУДЗЬКО.

НАСУСТРАЧ 1-му МАЯ

СПЕКТАКЛІ І КАНЦЭРТЫ Ў ПЕРШАМАЙСКІЯ ДНІ

Работнікі мастацтваў актыўна рыхтуюцца да першамайскіх святаў. Тэатры БССР пакажуць гледачу свой лепшы рэпертуар, які налічвае каля 50 пастановак. Сюды ўваходзяць «Міхась Падгорны», «Бахчысарайскі фантан», «Царская нявеста», «Падзь Сярэбраная», «Партызаны», «Чалавек з ружжом», «Тэв'е-малочнік» і інш.

Многія тэатры пакажуць у першамайскія дні новыя пастаноўкі. Полацкі калгасна-соўгасны тэатр падрыхтаваў п'есу бр. Тур і Шэйніна «Генконсул». Магілеўскі Рускі драмтэатр, які пачаў 20 красавіка гастролі ў Менску, пакажа ў першамайскія дні прэм'еру «Палаўчанскія сады» Л. Леонава. Слуцкі калгасна-соўгасны тэатр сустракае 1 мая прэм'ерай «Васса Жэлезнова» М. Горкага. Заслаўскі (б. Барысаўскі) калгасна-соўгасны тэатр—п'есай Германа «Сын народа». Лялечны тэатр пакажа ў першамайскія дні прэм'еру «Мойдадыр» паводле Чукоўскага.

Вялікую канцэртную дзейнасць разгорне ў першамайскія дні эстрадны сектар Дзяржфілармоніі БССР. Сіламі Філармоніі, Тэатра оперы і балета, Кансерваторыі, Менскага Белдзярждрамтэатра і эстрадных калектываў Масквы, Ленінграда, Кіева, Баку і іншых гарадоў будзе дадзена звыш 140 канцэртаў, у тым ліку 20 для дзяцей і 14 для падшэфных часцей БАВА. Канцэрты будуць арганізаваны не толькі ў буйных гарадах рэспублікі, але і ў многіх раённых цэнтрах: Пухавічах, Старых Дарогах, Дзержынску, Лепелі, Чачэрску, Лоеве, Быхаве, Петрыкаве, Жыткавічах, Калінкавічах і інш. Для гэтай мэты Філармонія арганізавала 10 канцэртных брыгад.

П.

ЗВОДНЫ ХОР У 500 ЧАЛАВЕК

Магілеўскі абласны Дом народнай творчасці арганізаваў з харавых калектываў работнікаў сувязі, Педінстытута, Педвучылішча, чыгуначнага вузла, Дома піонераў і Музычнага вучылішча зводны хор у колькасці 500 чалавек. Напярэдадні I мая зводны хор выступіць са святочнай праграмай на тэатральнай плошчы, а ў часе першамайскай дэманстрацыі выканае перад трыбунай «Песню аб Сталіне».

Кіраванне хорам даручана педагогам Магілеўскай музычнай школы тт. Зісману і Еўстратаву. Выступленне зводнага хора будзе суправаджаць духавы аркестр Магілеўскага музычнага вучылішча.

ВЫЕЗД РАБОЧАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ У КАЛГАСЫ

1-га мая ў пагранічныя калгасы Менскай вобласці для паказу сваіх дасягненняў выедуць 10 брыгад, арганізаваных Менскім абласным Домам народнай творчасці з удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Кожная брыгада мае ў сваім складзе 12—14 спевакоў, танцораў, музыкантаў і чытальнікаў. Актыўны ўдзел у камплектаванні брыгад прынялі калектывы мастацкай самадзейнасці клубаў металістаў, будаўнікоў, работнікаў дзяржгандлю і групкома саюза рабочых лазняў і цырульняў.

ПЕРШАМАЙСКІ РЭПЕРТУАР ДАМОЎ СОЦКУЛЬТУРЫ

Менскі абласны Дом народнай творчасці паслаў дамам соцкультуры рад твораў і песень для папаўнення першамайскага рэпертуару. Пасланы «Песня аб прысязе» — музыка бр. Покрас, вершы Лебедзева-Кумача, «Песня аб маладосці» — музыка Коваля, вершы Сікорскай, «Лянок» — музыка Туранкова, «Марш артылерыстаў»—музыка бр. Покрас і інш.

У дапамогу калектывам дамоў соцкультуры выехалі метадысты Дома народнай творчасці.

ГОДЫ ВЯЛІКАГА РОСТУ СОВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

М. КЛІМКОВІЧ

23 красавіка 1932 года пастановай комуністычнай партыі былі ліквідаваны, як аджыўшыя сябе, такія формы арганізацыі пісьменніцкай грамадскасці, як ВОАПП, РАПП і іх рэспубліканскія аддзяленні. Партыя пераканалася, што гэтыя формы не толькі зжылі сябе, але сталі тормазам у справе далейшага аб'яднання совецкіх пісьменнікаў для выканання задач, якія высоўваліся жыццём совецкага народа перад літаратурай. РАПП, з-за сваёй фракцыйнасці, стаў прытулкам трацкісцка-бухарынскіх і нацыяналістычных элементаў, якія імкнуліся дэзарыентыраваць совецкую літаратуру, адсунуць на задні план сапраўдных мастакоў слова, не даць ім расці і развівацца.

Ліквідацыя ВОАПП'аўскіх арганізацый яшчэ раз падкрэсліла, што партыя ніколі не прытрымліваецца застылых догмаў у сваёй арганізацыйнай рабоце, а ў залежнасці ад канкрэтнай абстаноўкі — гібка і своечасова мяняе формы работы, каб забяспечыць выкананне сваёй асноўнай задачы — пабудовы бяскласавага грамадства. Жыццё надзвычай хутка пацвердзіла правільнасць і жыццёвую неабходнасць гэтай меры.

Ліквідацыя ВОАПП'а (і БелАПП'а ў нас на Беларусі) паскорыла пераход на совецкія пазіцыі старэйшых майстроў мастацкага слова, выбіла глебу з-пад ног замаскіраваўшыхся варожых элементаў. Партыя нанесла руйнуючы ўдар па носьбітах беспрынцыпных рознагалоссяў у пісьменніцкім асяроддзі, паказала сапраўдны твар розных літаратурных «груп» і «групачак», з усёй відавочнасцю давёўшы ўсім і кожнаму, што традыцыйная апазіцыйнасць дарэволюцыйных літаратараў да рэчаіснасці згубіла глебу пад сваімі нагамі з таго часу, як гэта рэчаіснасць стала рабіцца рукамі перадавога класа чалавецтва.

Ліквідацыя ВОАПП'а і яго філіялаў спрыяла палітычнаму і творчаму «самавызначэнню» пісьменнікаў. Гэта мера была праведзена своечасова, якраз у той час, калі маладыя пролетарскія пісьменнікі сталі асноўным і моцным касцяком літаратуры, а лепшыя пісьменнікі старэйшага пакалення, якія дагэтуль знаходзіліся па-за межамі афіцыйна прызнаных пролетарскіх арганізацый, сталі па-сапраўднаму авалодваць метадам соцыялістычнага рэалізма, сумленна служыць соцыялізму.

Сямігадовы шлях развіцця совецкай літаратуры пасля красавіцкай пастановы ЦК ВКП(б) 1932 года пацвердзіў выключную важнасць гэтага мудрага рашэння партыі. Сведчанне гэтаму — магутны рост совецкай літаратуры, аўтарытэт яе ў масавага чытача і вялікая роля, якая адводзіцца ёй партыяй і ўрадам у будаўніцтве комуністычнага грамадства.

Наўрад ці трэба даводзіць гэта прыкладамі, — дастаткова ўспомніць творы беларускіх пісьменнікаў за апошнія годы, каб пераканацца ў вялікім росце совецкай літаратуры. Народныя паэты-ордэнаносцы Янка Купала і Якуб Колас, малады паэт Аркадзь Куляшоў і яшчэ больш малады паэт Пімен Панчанка, першая кніга вершаў якога выйшла ў гэтым годзе, з аднолькавых палітычных пазіцый, з аднолькавай любоўю да радзімы ўслаўляюць шчаслівае жыццё совецкага чалавека, перад якім соцыялізм адкрыў найшырэйшыя прасторы жыцця, навукі, мастацтва. Пісьменнік-ордэнаносец Змітрок Бядуля, малады паэт Алесь Жаўрук працуюць над тэматыкай гераічнай барацьбы іспанскага народа супроць італа-нямецкай фашысцкай інтэрвенцыі і імкнуцца адлюстраваць вялікую любоў нашага народа да рэволюцыйнай Іспаніі. Ордэнаносец П. Броўка, Рамановіч, Шапавалаў, Эдзі Агняцвет працуюць над стварэннем беларускіх совецкіх опер. Кандрат Крапіва, Гурскі, ордэнаносец П. Глебка, М. Паслядовіч напружана працуюць над стварэннем новых совецкіх п'ес для нашых тэатраў.

За гэтыя сем год паявіліся такія выдатныя творы, як «Дрыгва» і «У пушчах Палесся» Якуба Коласа, як «Пагібель воўка» і «Будучыня» Эдуарда Самуйлёнка, як «Партызаны» Кандрата Крапівы, як «Васіль Баранаў» і «У зялёнай дуброве» А. Куляшова, як «Крывёю сэрца» А. Жаўрука, «Мужнасць» П. Глебкі, «1914» і «Кацярына» П. Броўкі, «Міколка-паравоз» М. Лынькова і многія іншыя.

За гэтыя сем год народныя паэты рэспублікі Янка Купала і Якуб Колас напісалі вялікую колькасць вершаў, адлюстроўваючых нашу совецкую рэчаіснасць, совецкіх людзей. Іх вершы, асветленыя радасцю новага жыцця, набылі новае, жыццесцвярджальнае гучанне, праўдзіва паказваючы розніцу паміж доляй народа ў змрочныя часы царызма і ў радасныя часы нашай сталінскай эпохі.

За гэтыя часы вырасла, узмужнела, удасканаліла сваё майстэрства совецкая пісьменніцкая моладзь, талент якой развіўся дзякуючы дбайным клопатам партыі і совецкага народа і загартоўваўся ў жорсткіх класавых схватках з ворагамі. За гэтыя сем год зніклі са старонак друку і быту пісьменнікаў спрэчкі аб патрэбнасці ці непатрэбнасці, аб прыемлемасці ці неприемлемасці ярка выражанай тэндэнцыйнасці літаратуры. Зніклі спрэчкі аб метадзе адлюстравання рэчаіснасці: метад соцыялістычнага рэалізма стаў адзіным метадам, прыемлемым і для пісьменніка і для чытача.

За гэты час літаратары навучыліся чула рэагіраваць на запросы чытача, на «соцыяльны заказ» эпохі. За гэты час, нарэшце, узнялася якасць літаратуры, што партыя і ўрад адзначылі высокім узнагароджаннем пісьменнікаў.

XVIII з'езд ВКП(б) высунуў перад совецкай інтэлігенцыяй гіганцкую задачу: дапамагчы партыі ў комуністычным выхаванні мас, у ліквідацыі перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей. Інтэлігенцыя — соль зямлі совецкай, — так названа яна ў гістарычным дакладзе таварыша Молатава. Гэта абавязвае работнікаў літаратуры ўзброіць сябе самай дасканалай зброяй пазнання свету, пазнання грамадскіх з'яў і падзей—марксізмам-ленінізмам, веданнем гісторыі нашай партыі, бо толькі такое ўзбраенне дае сілу арыентыроўкі, дае магчымасць на кожным участку работы знайсці найбольш правільныя шляхі, каб ісці самому і весці масы к комунізму.

«З пункту погляду культурнага развіцця народа справаздачны перыяд быў сапраўды перыядам культурнай рэволюцыі», — кажа таварыш Сталін. А гэта азначае, што не толькі ў сотні разоў пашырыўся круг чытачоў совецкай літаратуры, але і ў шмат разоў узрасла яго патрабавальнасць да пісьменніка. Сучасны совецкі чытач не задавальваецца агітацыйнай п'есай ці кнігай, якую злабадзённую тэму яна-б ні трактавала. Ён патрабуе, каб гэта тэма ўкладвалася ў высокую мастацкую форму, у сапраўдныя мастацкія вобразы. Таксама не захопіць яго і з густам зробленая мастацкая рэч, калі яна не дапамагае яго практычным задачам, калі яна па сваёй ідэйнай накіраванасці стаіць ніжэй узроўню чытача.

Нажаль, наша літаратурная крытыка яўна не спраўляецца са сваёй задачай, яна часта не адлюстроўвае нават таго, што можа сказаць і гаворыць радавы чытач. Але гэта з'явішча часовае — патрабаваннямі чытача будзе выраўнен і гэты ўчастак літаратуры.

Вобразы нашай літаратуры, яе тэматыка, яе эмацыянальнае ўздзейнічанне павінны быць накіраваны на прапаганду і сцвярджэнне ідэй комунізма, на сцвярджэнне новага грамадскага парадку, спалучаючы элементы выхаваўчыя і пазнавальныя з элементамі эстэтычнымі. Пройдзены намі шлях з часу ліквідацыі ВОАПП'а паказаў, што совецкая літаратура стала на гэты шлях і мае ўжо не мала поспехаў.

Вобразы таварыша Леніна і таварыша Сталіна і іх бліжэйшых саратнікаў з вялікай любоўю адлюстраваны ў калектыўных паэмах нашых паэтаў, у паэмах «Мужнасць», «У тыя дні» П. Глебкі, «Фелікс Дзержынскі» Эдзі Агняцвет, у светлых і ўзнёслых думках-песнях Янкі Купалы і Якуба Коласа, у гарачых радках Эд. Самуйлёнка, ў новых песнях, якія напісаны ўсімі нашымі паэтамі за апошні час. Любоў да радзімы, гатоўнасць аддаць за яе жыццё — лейтматыў многіх нашых твораў. Цудоўны вобраз Васіля Баранава, замучанага японскімі самураямі, народны вобраз дзеда Талаша — героя партызанскіх баёў з белапалякамі, сотні вершаў маладых чырвонаармейскіх паэтаў — з'яўляюцца яркім увасабленнем гэтай любві і адданасці радзіме. У нас ёсць творы — «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы і інш., якія зрываюць маскі з ворагаў народа, выкрываюць метады іх агіднай дзейнасці, выклікаючы вялікую нянавісць чытача да ўсіх і ўсякіх здраднікаў. Але для таго, каб мастацкае слова было моцным сродкам барацьбы за выкананне гіганцкіх задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў трэцяй сталінскай пяцігодцы, патрабуецца сур'ёзная і адданая работа ўсяго пісьменніцкага калектыва, вялікая дапамога маладым пісьменніцкім кадрам.

Нам нехапае яшчэ смелага ўзлёту творчай думкі пісьменніка, нехапае таго, каб наша літаратура была такой-жа шматкрасачнай, рознастайнай, цікавай і складанай, як адлюстроўваемае ёю жыццё. Рэдактарская і крытычная нівеліроўка і прыгладжванне «пад сярэдні ўзровень» адчуваюцца яшчэ на радзе твораў. Гэтым тлумачыцца, напрыклад, тое, што красачна напісаная аповесць Бядулі «Салавей» ператварылася ў нудны і прыгладжаны спектакль на сцэне Менскага драмтэатра. Гэтым-жа тлумачыцца паўтарэнне раду вобразаў у нашых п'есах, схематызм у паказе станоўчых і адмоўных тыпаў і г. д. Адчуваецца гэта і ў паэзіі, калі вершы паэтаў манатонна перапяваюць адну і тую-ж думку і друкуюцца, здаецца, толькі для таго, каб на гэтыя творы заўтра забыліся.

У нас мала сапраўды мастацкіх, шырока задуманых і глыбока выкананых вобразаў, галоўным чынам станоўчага парадку. Жыццё нам паказвае шмат прыкладаў, калі новыя людзі, выхаваныя рэволюцыяй, сваёй прыкладнай работай ламаюць старыя нормы вытворчасці, сваім вынаходніцтвам твораць рэволюцыю ў вытворчасці і сельскай гаспадарцы. Жыццё паказвае, як гэтыя людзі дабіваюцца распаўсюджання свайго вынаходніцтва часам праз жорсткую барацьбу з руцінай і ворагамі. Аднак, нашы пісьменнікі не навучыліся яшчэ паказваць вобразы гэтых людзей і іх страсную барацьбу за комунізм.

Мы не ў такой меры, як гэта патрэбна, удзяляем увагу абароннай тэматыцы і тэматыцы барацьбы з фашызмам. Біць па змяінаму фашысцкаму адродзю, мабілізаваць усе сілы народа на адпор вынырнуўшым з імглы сярэдневякоўя ордам канібалаў і разбойнікаў—свяшчэнны абавязак нашай літаратуры.

На хуткую ліквідацыю гэтых вузкіх месц у нашай літаратуры будуць накіраваны намаганні ўсіх совецкіх пісьменнікаў, і мы ўпэўнены, што з поспехам вырашым гэту задачу.

СТВОРЫМ СПЕКТАКЛІ, ВАРТЫЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭПОХІ

* * *

З большай энергіяй рыхтавацца да дэкады

Падрыхтоўка да дэкады музычна-творчых і выканаўчых арганізацый ідзе па лініі стварэння оперных беларускіх спектакляў і падрыхтоўкі заключнага канцэрта на дэкадзе. У галіне опернай і балетнай творчасці зараз у цэнтры ўвагі знаходзіцца дапрацоўка оперы Цікоцкага «Міхась Падгорны» і работа па пастаноўцы оперы «Дрыгва» Багатырова і балета «Салавей» Крошнера.

Рыхтуе дзве новыя оперы кампазітар Туранкоў — «Кветка шчасця» і «Пагранічнікі».

Лібрэта «Міхася Падгорнага» дапрацоўваецца паэтам П. Броўкам з мэтай большага выяўлення вобраза самога Міхася, надання спектаклю больш сціслых і разам з тым больш красачных, яркіх элементаў. Адначасова разам з паэтам П. Глебкам тав. Броўка прыступіў да работы над лібрэта оперы «Кветка шчасця». Кампазітар Туранкоў у сучасны момант заканчвае клавір оперы «Пагранічнікі» (лібрэта Шапавалава).

Зараз тэатр мае яшчэ адно, у асноўным закончанае, лібрэта—«Далёкія зарніцы» (назва ўмоўная) М. Клімковіча.

Але ў справе стварэння новых оперна-балетных спектакляў ёсць шмат перашкод. Так, дагэтуль не зроблен канчатковы варыянт балета «Салавей», хаця тэатр меў для гэтага досыць часу. Не забяспечаны лібрэта кампазітары Залатароў і Аладаў.

Для заключнага канцэрта кампазітары зараз пішуць песню аб таварышу Сталіне, «Прывет Маскве», абаронную песню і іншыя. Тэксты песень напісаны народным паэтам рэспублікі ордэнаносцам Я. Коласам, паэтамі Клімковічам і Шапаваламым. Музыку песень аб таварышу Сталіне і «Прывет Маскве» пішуць усе беларускія кампазітары. Абаронную фінальную песню пішуць кампазітары Туранкоў, Самохін, Палонскі, Іваноў. Чырвонаармейскую песню і пляску пішуць кампазітары Багатыроў. Любан, піонерскую песню і пляску — Ефімаў, Равенскі, Лукас. Над падрыхтоўкай выступлення групы адароных дзяцей працуюць кампазітары Аладаў, Клумаў, Падкавыраў, танцавальныя нумары пішуць кампазітары Цікоцкі, Крошнер, Шчэглоў. Большасць кампазітараў прыступае да работы па апрацоўцы савецкага песеннага фальклору. У маі для зборання і запісу фальклору выедуць у раёны кампазітары Падкавыраў, Іваноў, Равенскі.

Сярод калектываў Філармоніі ідзе работа па адбору рэпертуару для дэкады.

Але ў рабоце па падрыхтоўцы заключнага канцэрта ёсць цэлы рад непаладак і недапрацовак. Пісьменнікі і паэты недастаткова энергічна і своечасова даюць тэкставы матэрыял, затрымліваючы гэтым работу кампазітараў. План канцэрта (пастаноўшчык Галейзоўскі) намечан толькі ў агульных контурах, дэтальна не распрацаван. Не ўстаноўлен таксама і дакладны рэпертуар канцэрта.

Музычны сектар Упраўлення па справах мастацтваў і Філармонія толькі складаюць арыентыровачныя намёткі.

Неабходна ўлічваць і тую акалічнасць, што музычныя калектывы, апрача ўдзелу ў заключным канцэрце, будуць выступаць у радзе канцэртаў у Маскве. Гэта ўскладае вялікія задачы на калектывы Філармоніі, Радыёкамітэта, Кансерваторыі, на салістаў Тэатра оперы і балета, драматычных тэатраў. Патрэбна вялікая работа над праграмамі і ўдасканаленнем майстэрства выканання.

Патрэбна большая аператыўнасць і энергія ў справе падрыхтоўкі да дэкады

Н. ШЧЭГЛОЎ.

ЗА ВЫСОКУЮ МАСТАЦКУЮ ЯКАСЦЬ СПЕКТАКЛЯЎ

Гутарка з мастацкім кіраўніком Белдзяржрамтэатра засл. арт. рэсп. Л. Рахленка

Калектыў Менскага Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра з натхненнем і ўсведамленнем вялікай адказнасці разгортвае падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

У ліпені 1940 года тэатру спаўняецца 20 год. Такім чынам на дэкадзе наш старэйшы тэатр прадэманструе свой творчы рост за дваццаць год.

Чатыры спектаклі намячае тэатр для паказу ў Маскве: «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, «Апошнія» А. М. Горкага. Тэатр пакажа, такім чынам, не толькі лепшыя творы беларускай драматургіі, але і асваенне рускай класікі, у прыватнасці горкаўскіх п'ес, якія ворагамі народа доўгі час не дапускаліся на беларускую сцэну.

«Апошнія» і «Партызаны» — спектаклі, якія пастаўлены ўжо тэатрам і шырока вядомы гледачу. Рыхтуючыся да дэкады, тэатр нанава пераглядае і дапрацоўвае іх. Пастаноўшчык спектакля «Апошнія» засл. арт. рэсп. М. А. Зораў перапрацоўвае свой пастановачны план, ідучы па лініі паглыбленага паказу ўзаемаадносін людзей, больш яркага раскрыцця эпохі. Мастак Власюк працуе над эскізам новых дэкарацый.

Драматург К. Крапіва дапрацоўвае асобныя сцэны п'есы «Партызаны», узмацняючы паказ партызанскага руху, паказ барацьбы беларускага народа з белапольскімі акупантамі. У чэрвені пачнуцца рэпетыцыі п'есы ў новым варыянце. Для ўзмацнення мастацкай якасці спектакля на некаторыя ролі ўводзяцца новыя выканаўцы. Вялікая ўвага будзе звернута на культуру выканання эпізадычных роляй і распрацоўку масавых сцэн. Мастак Б. Малкін нанава афармляе спектакль.

Прынята да пастаноўкі сатырычная камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Аўтар прадставіў тэатру канчатковы сцэнічны варыянт п'есы. Камедыю будзе ставіць засл. арт. рэсп. Л. Г. Рахленка. Эпіграфам да будучага спектакля тэатр бярэ словы тав. Жданава: «Нявыкрытыя асіныя гнёзды ворагаў шукайце перш за ўсё сярод паклёпнікаў».

Мастацкае афармленне будзе зроблена мастаком Шкляевым.

У бліжэйшы час — у пачатку мая, адбудзецца прэм'ера спектакля Эд. Самуйлёнка «Пагібель воўка» — лепшай п'есы беларускай драматургіі. Над падрыхтоўкай гэтага спектакля з вялікай страснасцю і натхненнем працуе ўвесь калектыў тэатра. Афармляе спектакль малады мастак Н. Ушакоў.

Для кансультацыі ўсёй творчай работы тэатра ў перыяд падрыхтоўкі да дэкады запрошан рэжысёр МХАТ засл. арт. РСФСР Раеўскі, які ўжо аказвае творчую дапамогу рэжысёрам і мастакам Беларускага тэатра.

Пачата падрыхтоўка арганізацыі выстаўкі, якая адлюструе 20-гадовы шлях тэатра. На выстаўцы будуць прадстаўлены фота, макеты, матэрыялы прэсы і інш.

Увосені гэтага года тэатр выедзе на гастролі ў Ленінград, дзе пакажа ўвесь свой арыгінальны рэпертуар.

А. Б.

* * *

Работа над пастаноўкай «Пагібелі воўка» Эд. Самуйлёнка ў Менскім Беларускім драмтэатры. Рэжысёр К. Саннікаў. **На здымку:** рабочы момант. Абабурка — нар. арт. БССР В. Уладамірскі, Харкевіч— засл. арт. рэсп. Г. Глебаў.

Фота І. Каплінскага.

РАБОТА НАД ПАСТАНОЎКАЙ „ПАГІБЕЛІ ВОЎКА"

У гутарцы з нашым супрацоўнікам пастаноўшчык спектакля «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка ў Віцебскім Белдзяржрамтэатры заслужаны артыст рэспублікі рэжысёр П. С. Малчанаў расказаў аб падрыхтоўцы прэм'еры.

«Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка—адна з лепшых п'ес совецкай драматургіі. Тэатр атрымаў надзвычай удзячны драматургічны матэрыял, які дае магчымасць стварыць на ім манументальнае сцэнічнае палатно аб радаснай калгаснай працы, аб пераможным шэствіі совецкага народа, які змятае на сваім шляху ўсякія перашкоды, бязлітасна знішчае ўсякіх ворагаў.

П'еса «Пагібель воўка» — гераічная драма; яна гучыць, як велічны гімн вольнай зямлі, гімн працы шчаслівага совецкага народа. У п'есе па-майстэрску праўдзіва акрэслены вобразы совецкіх людзей—патрыётаў соцыялістычнай радзімы, і выразна паказана воўчае нутро ворагаў совецкага народа. Гэта п'еса з'яўляецца як-бы этапнай работай Віцебскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, яна з'яўляецца для тэатра новай ступенню ў аўладанні рэалістычным майстэрствам, у павышэнні тэатральнай культуры.

Увесь калектыў тэатра працуе над п'есай «Пагібель воўка» з вялікім захапленнем і ўздымам. Я стаўлю сваёй задачай,—гаворыць тав. Малчанаў,—стварыць спектакль, варты памяці Эдуарда Самуйлёнка, майго таварыша, з якім я асабіста дружыў і творча працаваў.

Для пастаноўкі спектакля мы мабілізавалі свае лепшыя сілы, лепшых актораў. Народны артыст рэспублікі Ільінскі будзе іграць ролю Харкевіча, заслужаны артыст рэспублікі Сяргейчык—Мірона Бокуця, заслужаная артыстка рэспублікі Кашэльнікава—Насцю, заслужаны артыст рэспублікі Звездачотаў—Лук'яна Рабічку; я,—гаворыць тав. Малчанаў,—буду выконваць ролю дзеда Язэпа, Скальскі—Абабурку, Іваноў—Дабрыніна, Шэлег—Усенку і інш.

Эдуард Самуйлёнак так удала выпісаў вобразы герояў п'есы, што дадаць да іх амаль нічога нельга. Усе яны жыццёвыя, рэальныя, такія, якімі і павінны быць, і таму ўся справа залежыць ад нашага ўмення трактаваць вобразы, ад правільнага разумення і раскрыцця вобразаў. Асаблівая ўвага звернута тэатрам на распрацоўку вобраза Мірона Бокуця. Мірон Бокуць—тыповы прадстаўнік совецкага народа, калгаснага сялянства. Ён багаты незвычайнай унутранай сілай, не многаслоўны, цвёрды і ўпэўнены ў сваёй сіле і сіле свайго народа. Ён клапатлівы гаспадар калгаснай маёмасці. Добры таварыш у адносінах да сумленных людзей, але ніколі не мае спагады да ворага. Вораг—зло, якое трэба рашуча выкараніць. Праз Мірона Бокуця нам хочацца паказаць, наколькі вяліка нянавісць і гнеў совецкага народа да людзей-ваўкоў, да тых, хто хоча зганьбіць, разбурыць шчаслівае жыццё калгаснікаў, наколькі вяліка зацікаўленасць кожнага совецкага патрыёта ў тым, каб хутчэй выкрыць воўчыя логавы, выкрыць ворагаў—шпіёнаў і дыверсантаў і знішчыць іх.

Усе станоўчыя героі п'есы такія задушэўныя, шчырыя. Яны працуюць не пакладаючы рук, заўсёды напагатове, заўсёды на варце і гатовы ў любую хвіліну ўдарыць па брудных лапах ворага, які памкнецца надарваць калгаснае жыццё.

П'еса «Пагібель воўка» паказвае не прыватную з'яву ў адным пагранічным калгасе,—гэта п'еса аб шчаслівым жыцці беларускага народа, гэта п'еса аб Совецкай Беларусі—несакрушальным фарпосце Совецкага Саюза на заходніх граніцах.

Удалая музыка кампазітара Е. Цікоцкага. Яна эмацыянальная і меладычная. Асабліва ўдала напісаны песні. Песня «На золку рана конь зайржаў» несумненна стане масавай, папулярнай песняй. Гледачы панясуць яе з сабою з тэатра.

Паказ спектакля затрымліваецца з-за макета. Прадстаўлены мастаком Нікіціным макет спектакля адхілен. Над новым афармленнем спектакля працуе мастак Нікалаеў, які забяспечан кваліфіцыраванай кансультацыяй мастака Вільямса. Гэта дае ўпэўненасць, што мастацкае афармленне спектакля будзе адпавядаць якасці п'есы.

У заключэнне рэжысёр П. Малчанаў заявіў, што прэм'ера «Пагібель воўка» будзе паказана Віцебскім тэатрам 15 мая ў часе гастрольнай паездкі для грамадскасці гор. Гомеля.

А. АСТРЭЙКА.

* * *

Нараджэнне п'есы і спектакля

Эдуард Самуйлёнак лічыў лепшым памочнікам у сваёй драматургічнай рабоце рэжысёра К. Н. Саннікава. І сапраўды, дружба драматурга і рэжысёра дала надзвычай плённыя творчыя вынікі. Першай драматургічнай работай Эд. Самуйлёнка з'явілася напісаная ім у 1935 годзе паводле свайго рамана «Тэорыя Каленбрун» п'еса «Сяржант Дроб». П'еса была пастаўлена К. Н. Саннікавым.

Другой і апошняй — «лебядзінай песняй» драматурга з'явілася п'еса «Пагібель воўка», якую К. Н. Саннікаў ставіць у Беларускім Дзяржаўным драматычным тэатры.

У пачатку 1938 года, калі Эдуард Самуйлёнак скончыў работу над раманам «Будучыня», — расказвае К. Н. Саннікаў, — я звярнуўся да Эдуарда Людвігавіча з прапановай напісаць п'есу для нашага тэатра аб граніцы, аб барацьбе патрыётаў нашай радзімы з ворагамі.

Эдуард Самуйлёнак з захапленнем пачаў распрацоўваць вобразы будучай п'есы і ўжо ў маі 1938 года прыслаў К. Н. Саннікаву з Крыма першы сцэнарны план п'есы «Пагібель воўка», які грунтаваўся на аднайменнай, не закончанай аўтарам, аповесці. Найбольшую ўвагу ўдзяляў драматург стварэнню станоўчых персанажаў. Ён пісаў рэжысёру: «Праз Мірона мы павінны паказаць **прэемственасць** класавай барацьбы з пакалення ў пакаленне, гістарычную ролю бальшэвікоў, з царскіх засценкаў вяшчаўшых аб «пагібелі воўка». «Пагібель воўка» — гэта, канешне, алегорыя, але яна павінна быць прадзельна зразумелай і ў дадным выпадку з'явіцца асноўнай ідэяй п'есы. Пагібель воўка, увасобленага ў фашызме, гібель уласніцкага воўка ў самой істоце совецкага чалавека — вось ідэя». І потым: «Задача ў тым і заключаецца, каб... зрабіць Мірона не хадзячай рэліквіяй царскай катаргі, а звычайным простым чалавекам, які хоць і гаворыць не зусім звычайныя рэчы, але не асабліва рэзка вылучаецца з агульнага асяроддзя».

У няспыннай сувязі з рэжысёрам акрэсліваліся вобразы і падзеі, якія павінны ўвайсці ў п'есу. І ў ліпені 1938 года Эд. Самуйлёнкам быў распрацаван канчатковы план п'есы. Ён пісаў, адпачываючы ў Дрысенскім раёне, Саннікаву: «П'еса будзе. Пабачыш сам».

З гэтага часу і пачынаецца натхнёная і плённая работа па напісанню п'есы. Перад намі сшытак — рукапіс п'есы. На ім адзначан час працы: «Жнівень — лістапад 1938 года». Кожная старонка сшытка гаворыць аб вялікай працы патрабавальнага мастака. Драматург шукаў найбольш сціслыя і простыя формы, дамагаўся напружанага дзеяння, поўнага і выразнага раскрыцця вобразаў. І ўся работа ішла ў кантакце з рэжысёрам. Не будзе памылкай назваць гэта сапраўдным творчым супрацоўніцтвам аўтара п'есы з аўтарам спектакля.

Некалькі разоў перагледаў драматург ролю Усенка, узмацняючы вобраз слаўнага пагранічніка — мужнага совецкага патрыёта; няспынна дапрацоўваў ролю бальшэвіка Дабрыніна. І пасля сканчэння п'есы Эдуард Самуйлёнак шкадаваў, што хвароба перашкаджае яму яшчэ больш узмацніць вобраз Дабрыніна.

Прыкаваны хваробай да пасцелі, Эд. Самуйлёнак не пакідаў думак аб п'есе. Пры кожнай сустрэчы з К. Н. Саннікавым драматург гаварыў, як удасканаліць асобныя сцэны, больш ярка акрэсліць вобразы. І ў апошнія дні свайго жыцця Эд. Самуйлёнак распрацаваў новы варыянт фінала п'есы. Гэта апошняя рэдакцыя фінала, уключаная ў п'есу ў пастаноўцы Белдзяржрамтэатра, з вялікай сілай заклікае гледача да пільнасці. У заключным дыялагу калгаснік Язэп звяртаецца да начальніка заставы Усенка:

«**Язэп** (кідаецца да Усенка). Таварыш Усенка, браток ты мой дарагі, дык што-ж гэта — выходзіць, ворагі гэтыя сярод нас былі, а мы не бачылі? Можа, яшчэ дзе ёсць? Ты скажы. Я яго напалам разарву.

Усенка. Ёсць, таварыш Язэп.

Язэп. Дзе?

Усенка.—А вось там (паказвае ў бок граніцы), забыўся? Адтуль за намі сочыць вораг. І ён гатовы скарыстаць кожную магчымасць, каб шкодзіць нам. Будзем заўсёды помніць словы нашага правадыра: покуль існуе варожы свет, будуць у нас і шпіёны, і дыверсанты, і ўсякія, розных масцей і колераў, ворагі. Пільнасць, вялікая пільнасць патрабуецца ад нас».

Пастаноўшчык-рэжысёр К. Н. Саннікаў, дзелячыся з намі думкамі пра будучы спектакль, гаворыць:

— Я лічу асноўнай сваёй задачай данесці да гледача ўсе думкі аўтара, паказаць вялікую любоў і адданасць совецкага народа бальшэвіцкай партыі, таварышу Сталіну, паказаць веліч нашай эпохі, назаўсёды знішчыўшай на нашай зямлі звярыны закон капіталізма «чалавек чалавеку воўк», — веліч эпохі бясакласавага соцыялістычнага грамадства. Мы імкнемся з найбольшай мастацкай сілай і праўдзівасцю паказаць тыповыя вобразы совецкіх патрыётаў. І ворагаў трэба паказаць такімі, як яны ёсць, — паказаць іх каварства і хітрую маскіроўку. Надзвычай удзячны матэрыял дае п'еса для актораў. І акторы натхнёна працуюць над ролямі.

Вобраз мацёрага воўка — Харкевіча стварае заслужаны артыст рэспублікі Г. П. Глебаў. Народны артыст рэспублікі В. О. Уладамірскі працуе над роляю Абабуркі. Плённа працуюць над вобразамі совецкіх патрыётаў заслужаны артыст рэспублікі В. І. Дзядзюшка (калгаснік Мірон), заслужаны артыст рэспублікі Л. Г. Рахленка (сакратар райкома Дабрынін), арт. Б. К. Кудраўцаў (начзаставы Усенка), арт. А. А. Бараноўскі (калгаснік Язэп) і іншыя ўдзельнікі спектакля.

Мы імкнемся з найбольшай паўнатой акрэсліць характары персанажаў. Вывучэнне аўтарскіх характарыстык вобразаў і варыянтаў асобных сцэн дапамагаюць і мне, рэжысёру, і акторам больш глыбока зразумець думкі аўтара, знайсці патрэбныя сродкі сцэнічнага ўвасаблення вобразаў, з найбольшай праўдзівасцю і мастацкай выразнасцю раскрыць ідэю п'есы. Мы павінны стварыць спектакль, які будзе заклікаць да пільнасці і развіваць у гледача пачуццё совецкага патрыятызма.

Заканчваецца работа над спектаклем. У пачатку мая глядач будзе бачыць яго на сцэне. Дарэчы, трэба адзначыць, што рабоце над гэтай пастаноўкай тэатр не ўдзяляў той увагі, якая патрабавалася. Зараз кіраўніцтва і ўвесь калектыў тэатра павінны зрабіць усё для стварэння спектакля вялікай ідэйнай і мастацкай сілы, які-б быў з гонарам паказан у Маскве на дэкадзе беларускага мастацтва, — спектакля, які ўзбагачаў-бы наша тэатральнае мастацтва так, як узбагачае п'еса «Пагібель воўка» нашу драматургію.

Юр.

Праф. А. ДЖЫВЕЛЕГАЎ

ВЯЛІКІ ДРАМАТУРГ

23 красавіка спаўняецца 375 год з дня нараджэння Вільяма Шэкспіра, аднаго з тытанаў сусветнай літаратуры. Даты, звязаныя з жыццём і творчасцю Шэкспіра, совецкай літаратуры больш дарагі, чым нават літаратуры шэкспіраўскай радзімы. Совецкі народ горача любіць англійскага паэта,—паэта, якога поруч з Эсхілам і Гётэ мацней за ўсё любіў Карл Маркс. Сярод скарбаў сусветнай літаратуры мала ёсць вяршынь, больш высокіх, чым «Ромео і Джульета», «Рычард III», «Гамлет», «Отэлло», «Кароль Лір», «Макбет», такіх крыніц радаснага сцвярджэння жыцця, як «Украшчэнне страпцівай», «Многа шуму з нічога», «Віндзорскія свавольніцы», «Сон у летнюю ноч», «Дванаццатая ноч».

Гісторыя ведае багата тэатральных арганізацый, народных у лепшым сэнсе гэтага слова: тэатр старажытнай Эллады, тэатр сярэдневяковых гарадоў, італьянскую камедыю дэль артэ, іспанскі тэатр у перыяд росквіту. Аднак нідзе сувязь тэатра з народнымі масамі не была такой цеснай і моцнай, як у Англіі пры каралеве Елізавеце ў апошняе дзесяцігоддзе XVI стагоддзя. І Шэкспір быў найбольш поўным увасабленнем гэтай сувязі.

Шэкспір ствараў адну за другой свае камедыі, хронікі і драмы з радаснай бесклапотнасцю, з адчуваннем светлага ўспрыняцця жыцця ва ўсіх яго праявах, з усведамленнем, што ён піша аднолькава і для рафініраванага прыдворнага, і для вучонага гуманіста, і для надзьмутага ўсякімі страхамі пурытаніна, і асабліва для чалавека з ракі: марака, лодачніка, матроса, партовага рабочага. Стаячы партэр шэкспіраўскага тэатра цалкам складаўся з дэмакратычных элементаў і гэты стаячы партэр быў далёка не самым спагадлівым крытыкам п'ес Шэкспіра і іншых драматургаў. Для гэтага гледача чулы паэт павінен быў будаваць свае п'есы так, каб у іх жыццё было паказана ва ўсёй сваёй сапраўднай складанасці, ва ўсёй сваёй соцыяльнай стракатасці, ва ўсім бурным кіпенні рэальных, не выдуманых, а праўдападобных адчуванняў і страсцей. Вобразы людзей, якія праносіліся па падмостках шэкспіраўскага тэатра, павінны былі жыць сапраўдным жыццём, у іх жылах павінна была пераліваццца сапраўдная гарачая кроў.

Гэта тое, што так добра адчуў у Шэкспіру наш Пушкін, калі запісваў свае размышленні пра ўласнага «Барыса Гадунова»: «Па прыкладу Шэкспіра я абмежаваўся паказам эпохі і гістарычных асоб, не гонячыся за сцэнічнымі эфектамі, рамантычным пафасам і т. п.». Гэта тое, што адразу адчулі і Маркс, і Энгельс, калі Фердынанд Ласаль прыслаў ім сваю трагедыю «Франц фон Зіккінген». Маркс пісаў Ласалю: «Прадстаўнікі сялян і рэволюцыйных элементаў у гарадах павінны былі скласці істотны актыўны фон... Табе само сабою прышлося-б тады больш шэкспірызіраваць, між тым як зараз я лічу шыллераўшчыну, ператварэнне індывідаў у простыя рупары духу часу, тваім буйнейшым недахопам». З свайго боку Энгельс дадае да гэтага: «Пры маім поглядзе на драму, згодна якога за ідэйным момантам не трэба забываць рэалістычны, за Шылерам Шэкспіра, прыцягненне тагочаснай гэтак здзіўляючай плебейскай грамадскасці прынесла-б яшчэ зусім новы матэрыял для ажыўлення п'есы».

Пушкін сказаў у размышленнях аб «Гадунову»: «Шэкспіра я пераймаў у яго вольным і шырокім паказе характараў, у неахайным і простым складанні тыпаў». І зноў у гэтых словах, як і ў прыведзеных вышэй, наш вялікі паэт адчуў і адгадаў творчы метад геніяльнага сабрата. «Шырокі і вольны паказ характараў» азначае паказ жывых людзей, кожнае дзеянне якіх і кожны помысел да канца пераканальны для ўсякага. Гэта—вяршыня рэалістычнага мастацтва. Усе ведаюць, што Шэкспір браў вобразы сваіх п'ес з усякай літаратуры, якая трапляла яму па руку: з італьянскай навелы, з сучаснай англійскай аповесці, з біяграфіі Плутарха, з хронікі Голіншэда. Там ён знаходзіў мімалётны сілуэт чалавека, своеасаблівы беглы накід алоўкам. А калі ён перасаджваў гэты сілуэт у сваю п'есу, ён набываў плоць і кроў. Характары Шэкспіра могуць быць складанымі, але яны ніколі не бываюць фальшывымі. Іх пераканальнасць ствараецца не толькі шляхам псіхалагічнай характарыстыкі, але і паказам іх у такіх абставінах, якія надаюць кожнаму вобразу адбітак соцыяльнай праўды. І ўсякі колькі-небудзь дэтальна распрацаваны вобраз ніколі не бывае ў Шэкспіра статычным. Ён раскрываецца да канца толькі ў клубку падзей, якія напаўняюць сюжэт. Отэлло, прастадушны, непасрэдны, вельмі гуманны чалавек, пад уплывам падзей, у якія ён аказаўся ўплеценым, паступова выяўляе залежы першабытнай дзікасці, прыхаваныя раней і выкліканыя к шалёнай успышцы інтрыгамі Яго. Такое дыялектычнае раскрыццё характару жывога чалавека для Шэкспіра здзіўляюча тыповае. Калі ў сваіх крыніцах—у таропкім накідзе навелы ці хронікі ён знаходзіць вобраз, які патрэбен яму пры дадзеным становішчы яго творчай работы, выабражэнне паэта раскрывае яму ў іх жывога чалавека. Так Мікельанджэло ў бясформеннай мрамарнай глыбе, якая шмат год ляжала без ужытку, выабражэннем мастака адразу ўбачыў свайго Давіда.

Вобразы Шэкспіра, аднак, рэдка бываюць голымі, толькі псіхалагічна пераканальнымі характарамі. У іх заўсёды жыве ідэйны і маральны змест. Калі мы зараз з такой вялікай унутранай трывогай успрымаем лепшыя вобразы Шэкспіра, калі яны праз чатырыста год здольны хваляваць людзей, якія жывуць у іншых грамадскіх умовах і пад іншым небам, дык значная доля гэтай іх здольнасці павінна быць прыпісана іх ідэйнаму і маральнаму зместу. Стала агульным месцам гаварыць аб Шэкспіру, гэтак-жа, як і аб яго вялікіх сучасніках Рабле і Сервантэсу, што яны гуманісты. Але важна заўважыць, што ў Рабле, Сервантэса, Бена Джансона, Шэкспіра гуманізм атрымоўвае ўпершыню такі змест, які набліжае яго да гуманізма Горкага: у ім пачынаюць гучаць дэмакратычныя ноты, зусім чуждыя гуманізму Петраркі ці Эразма. Рабле, Сервантэс і Шэкспір іменна таму і дарагі нам, што ў іх творчасці гэта соцыяльная насычанасць гуманізма, яго блізкасць да народнага разумення, яго зацікаўленасць патрэбамі і інтарэсамі масы прапоўных упершыню становіцца элементам культуры. Шэкспір адчуваў неабходнасць дэмакратызацыі гуманістычных ідэалаў найбольш канкрэтна і непасрэдна: ён чэрпаў іх у няспынным назіранні сваёй дэмакратычнай публікі і адчуваў, трэба думаць, тыя карэктывы да свайго ідэалагічнага свету, якія ад гэтай публікі выходзілі.

Калі ён зразумеў, што змена дынастыі стварае значна менш удзячныя ўмовы для нацыянальных інтарэсаў Англіі, у яго паявілася адчуванне, што яму падразаюць крыллі. Над краінай навісла нагроза феадальнай рэакцыі, паўстала пытанне аб барацьбе супроць яе, узнялася крывавая здань грамадзянскай вайны. Пачынаючы з 1601 года Шэкспір прадбачыў наступленне грамадзянскай вайны. Гэта відаць з таго, з якой цікавасцю ён распрацоўвае гэту тэму ў сваіх п'есах: «Юлій Цэзар», «Кароль Лір», «Макбет», «Антоній і Клеапатра». З гэтага моманту ў яго п'есах наяўляюцца змрочныя вобразы геніяў зла, якія будуць народжаны грамадзянскай вайной гэтак-жа, як будуць народжаны ёю і сапраўдныя гераічныя фігуры.

Дзесяць год працаваў Шэкспір пры Якаве І, а ў 1613 годзе, як Праспера, закапаў цудоўнае жэзла сваёй творчасці глыбока ў зямлю і выехаў у свой родны Стратфорд на Эвоне, дзе пражыў удалі ад творчых захапленняў, далёка ад свайго тэатра, далёка ад сваёй публікі апошнія чатыры годы свайго жыцця. Смерць прышла да яго ў такі момант, калі ён быў ужо бяссільны даць што-небудзь новае паэзіі і тэатру.

Але ён сказаў усё, што хацеў сказаць. Галерэя яго вобразаў была поўная. Свет ідэй, які ён завяшчаў чалавецтву, быў творча дадуман да канца. Праз галовы гледачоў, якія стаялі перад сцэнаю яго тэатра, праз галовы сваіх сучаснікаў ён кідаў свае заветы ўсяму чалавецтву. Былі моманты ў гісторыі, калі гэтыя заветы не ўспрымаліся зусім. Былі моманты, калі яны пачыналі цікавіць больш ці менш шырокія кругі. І толькі ў нас, у Совецкім Саюзе, ідэйны свет Шэкспіра, вобразы яго герояў, як носьбітаў цэлай гуманістычнай праграмы, грамадскі фон яго п'ес, як нейкі складаны соцыяльны свет, — сталі даступнымі да канца і цікавяць кожнага незалежна ад узросту, грамадскага становішча, прафесіі, нацыянальнасці. Шэкспір — наш паэт, совецкі паэт. Шэкспір — прадвяшчальнік таго гуманізма, які насычан не толькі дэмакратычнымі ідэямі, як у яго творах, але які насычан ідэямі соцыялізма і комунізма, які ў сталінскай формуле клопату аб людзях знайшоў сваё вышэйшае і найбольш поўнае выражэнне.

Вось чаму святкаванне юбілея Шэкспіра ў нас па свайму размаху далёка перарастае значэнне простай літаратурнай гадавіны. Яно ператвараецца ў культурную падзею, якую ўрачыста адзначаюць народы Совецкага Саюза.

У ГАСЦЯХ У КАЛГАСНІКАЎ

Адкрытае пісьмо майстрам мастацтваў

З ростам матэрыяльнага добрабыту ўсёй краіны расце і культура нашай совецкай вёскі, якая прад'яўляе ўсё новыя і новыя культурныя патрабаванні. Калгаснікі хочуць жыць весела, культурна, бо калі весела і культурна жывецца, дык і работа спорыцца. Прайшоўшыя алімпіяды мастацкай самадзейнасці паказалі, што ў асяроддзі калгаснікаў ёсць таленавітыя музыканты, спевакі, танцоры і г. д. Многія калгаснікі сталі таленавітымі артыстамі, выдатнымі музыкантамі і вакалістамі.

Але, не гледзячы на наяўнасць у нас у рэспубліцы выдатных майстроў мастацтваў, мы, нажаль, павінны канстаціраваць, што ў нашым раёне яны бываюць вельмі рэдка.

Мы, калгаснікі арцелі «Чырвоны сцяг» Вітуніцкага сельсовета Бягомльскага раёна просім майстроў мастацтваў адгукнуцца на наш заклік і прыехаць да нас у госці паказаць сваё майстэрства.

Мы звяртаемся да народнай артысткі БССР тав. Александроўскай, да народнага артыста БССР тав. Владамірскага, да заслужаных артыстаў рэспублікі тт. Дзянісава, Балоціна, Аляксеевай, да артыстаў Філармоніі з просьбай наведаць наш калгас. Мы спадзяемся, што вы першыя адгукнецеся на наш заклік і заклічаце паследваць свайму прыкладу іншых майстроў мастацтваў. Дабро пажалаваць у наш калгас!

Думаем, што наша пісьмо выражае жаданне калгаснікаў не толькі Вітуніцкага сельсовета, але і ўсіх калгаснікаў Совецкай Беларусі.

Чакаем вашага адказу.

Калгаснікі арцелі «Чырвоны сцяг».

* * *

Адказам на пісьмо калгаснікаў арцелі «Чырвоны сцяг» паслужыў выезд 9 красавіка ў Бягомльскі раён работнікаў Дзяржаўнага опернага тэатра — заслужаных артыстаў рэспублікі Дзянісава і Аляксеевай, дырыжора Ратнера, работнікаў Менскага Беларускага Дзяржаўнага драмтэатра — народнага артыста рэспублікі Владамірскага, заслужаных артыстаў рэспублікі Ржэцкай і Платонава, артысткі Вашкевіч.

Сустрэча майстроў мастацтваў з калгаснікамі - стаханаўцамі Бягомльшчыны прайшла вельмі цёпла. Народны артыст БССР тав. Владамірскі падрабязна і ярка расказаў калгаснікам аб XVIII з'ездзе ВКП(б) і аб тым, як вітала з'езд дэлегацыя беларускага народа, у склад якой уваходзіў і ён. Старшыня калгаса «Чырвоны сцяг» тав. Пярэдня расказаў гасцям аб заможным і культурным жыцці калгаснікаў, аб барацьбе калгаса за высокі ўраджай — за 8 сталінскіх мільярдаў пудоў хлеба.

Пасля адбыўся вялікі канцэрт. Была выканана сцэна з першага акта п'есы Астроўскага «Без віны вінаватыя».

З вялікай увагай і адабрэннем сустрэлі калгаснікі выкананне вальса Шапэна тав. Ратнерам.

Засл. арт. рэсп. Дзянісаў выканаў рад вакальных твораў совецкіх кампазітараў. З выкананнем класікі і беларускіх народных песень — «Бульба», «Янка» — выступіла засл. арт. рэсп. Аляксеева.

Засл. арт. рэсп. Ржэцкая прачытала рад твораў совецкіх майстроў мастацкага слова. Засл. арт. рэсп. Платонаў прачытаў маналог Незнамава. Арт. Вашкевіч выканала рад беларускіх народных песень.

Выступленні кожнага ўдзельніка канцэрта сустракаліся з гарачым адабрэннем. Увага слухачоў натхняла актораў. Канцэрт прайшоў з поспехам.

Совецкі народ любіць мастацтва. Майстры мастацтва павінны несці сваё майстэрства ў глыбіню народных мас, сістэматычна рабіць выезды на прадпрыемствы і ў калгасы—у гарады і раёны рэспублікі.

М. І. ДЗЯНІСАЎ.
Заслужаны артыст БССР.

ПАШЫРАЦЬ І ЎЗМАЦНЯЦЬ СУВЯЗЬ МАЙСТРОЎ МАСТАЦТВАЎ З КАЛГАСНЫМ ГЛЕДАЧОМ

У першых чыслах сакавіка я атрымаў пісьмо, у якім майстры соцыялістычных палёў—калгаснікі арцелі «Чырвоны сцяг» Бягомльскага раёна звярталіся да мяне асабіста і да маіх таварышоў — майстроў мастацтваў нашай рэспублікі—з просьбай прыехаць да іх у госці, пазнаёміцца з імі, падзяліцца творчым вопытам, паказаць наша майстэрства.

Ініцыятыва калгаснікаў вельмі ўсхвалявала мяне і я загарэўся жаданнем як можна хутчэй і лепш выканаць іх просьбу.

Да пачатку вечара я пазнаёміўся з загадчыкам клуба, культработнікам, а таксама з некаторымі калгаснікамі, членамі праўлення клуба. У гутарцы з імі я даведаўся аб стане культмасавай работы і прышоў к вывалу, што ім патрэбен кваліфіцыраваны кіраўнік для драмгуртка.

Шмат самых элементарных пытанняў сцэнічнага мастацтва гурткоўцы самі не могуць вырашыць, і тыя простыя ісціны, якія я ім паспеў растлумачыць, для іх былі проста адкрыццём.

Цяга і жаданне калгаснікаў да самадзейнасці вялікая, але трэба яе ўмела і культурна ўзначальваць. Трэба пасылаць актывістаў калгаснай самадзейнасці на вучобу, прымацоўваючы на некаторы час гуртаводаў і культработнікаў калгаснай самадзейнасці да прафесіянальных тэатраў. Абласному аддзелу мастацтваў, а таксама Дому народнай творчасці БССР трэба сур'ёзна падумаць аб гэтым і прыняць неабходныя меры.

Клуб быў перапоўнен. Прышлі калгаснікі і байцы пагранічнікі, каб разам з намі правесці вечар. Да пачатку мастацкай часткі я расказаў сабраўшымся аб тым найшчаслівейшым для мяне дні, калі я ў ліку дэлегатаў беларускага народа 15 сакавіка меў гонар вітаць XVIII з'езд комуністычнай партыі, бачыць лепшых людзей нашай краіны, убачыць таго, да каго імкнуцца ўсе нашы сэрцы, хто наша гордасць, наша шчасце, — бацьку народаў вялікага Сталіна. Маё выступленне шмат разоў перапынялася апладысментамі.

Старшыня калгаса «Чырвоны сцяг» тав. Пярэдня ад імя ўсіх калгаснікаў і калгасніц, ударнікаў соцыялістычных палёў, абяцаў яшчэ больш разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва ў калгасе, каб соцыялістычныя палі змаглі даць краіне 8 мільярдаў пудоў хлеба, як сказаў таварыш Сталін.

Пасля пачалося выступленне нашай брыгады.

З вялікай увагай слухалі нас нашы паважаныя гаспадары, у якіх мы былі ў гасцях. Мне здаецца, што яны засталіся задаволенымі нашай творчай справаздачай, як і мы — іх шчырай гасціннасцю.

Мне хочацца толькі пажадаць, каб добрае культурнае пачынанне не заглохла, не абмежавалася толькі нашым выездам у калгас, а каб гэта ўвайшло ў сістэму культурнага шэфства работнікаў мастацтваў над аддаленымі калгасамі і пагранічнымі заставамі нашай рэспублікі.

В. О. ВЛАДАМІРСКІ.
Народны артыст БССР.

ГАСТРОЛІ ВІЦЕБСКАГА ТЭАТРА

Віцебскі Дзяржаўны Беларускі тэатр з 26 красавіка паказам спектакля «Чалавек з ружжом» пачынае гастролі ў Гомелі. Грамадскасці Гомеля тэатр пакажа, апрача памянёнага, спектаклі: «У пушчах Палесся», «Вайна», «Мяшчане», «Генконсул» і «Цярэнцій Іванавіч». 15 мая тэатр пакажа грамадскасці Гомеля прэм'еру «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка.

У канцы мая тэатр выяздждае на Украіну. Свае гастролі ён пачне ў Днепрапетроўску паказам спектакля «Пагібель воўка».

З 23 чэрвеня тэатр будзе працаваць у Кіеве, а з 15 ліпеня — у Харкаве.

К прыезду на гастролі на Украіну Віцебскі Дзяржаўны Беларускі тэатр разам з выдавецтвам «Мастацтва» выдасць кнігу на беларускай і украінскай мовах, у якой раскажа пра творчую работу тэатра і, у прыватнасці, пра работу над спектаклямі «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, «У пушчах Палесся» і «Вайна» Я. Коласа, «Чалавек з ружжом» Н. Пагодзіна і «Мяшчане» М. Горкага.

Пасля паездкі па Украіне тэатр прыедзе на гастролі ў Менск, дзе акрамя спектакля «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка пакажа сваю прэм'еру «Над Бярозай-ракой» П. Глебкі.

Кіностудыя «Мосфільм» рыхтуе новы гукавы мастацкі фільм «Сцяпан Разін». **На здымку:** кадр з фільма. Артыст-ордэнаносец А. Л. Абрыкосаў у ролі Разіна.

Фотахроніка ТАСС.

УЗМАЦНІЦЬ ПРОФРАБОТУ Ў ГОМЕЛЬСКІМ МУЗВУЧЫЛІШЧЫ

Нядаўна ў Гомельскім музвучылішчы адбылося пасяджэнне прэзідыума саюза работнікаў мастацтваў БССР. Прэзідыум заслухаў справаздачны даклад прафкома. Як высветлілася з даклада старшыні прафкома тав. Цвайг, профсаюзная работа ў музвучылішчы пастаўлена вельмі слаба. Прафком не цікавіцца жыццём студэнтаў, іх вучобай і бытавымі ўмовамі.

Пасляховасць студэнтаў нізкая: сярод 180 студэнтаў усяго 11 ударнікаў вучобы. Працоўная дысцыпліна слабая. Ёсць выпадкі прагулаў і спазненняў. Дырэктар вучылішча тав. Фрыдман не прымае мер для паляпшэння вучобы і бытавых умоў студэнтаў.

Вывучэнню гісторыі ВКП(б) прафком не ўдзяляе належнай увагі, у выніку 20 студэнтаў маюць дрэнныя адзнакі.

Прэзідыум саюза работнікаў мастацтваў даў прафкому рад указанняў аб яго далейшай рабоце.

М. ГУЦІН.

ШЭЎЧЭНКАЎСКІЯ ВЕЧАРЫ У МАГІЛЕВЕ

14 красавіка ў Магілеве адбыўся агульнагарадскі вечар, прысвечаны памяці паэта Т. Г. Шэўчэнка, арганізаваны праўленнем Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Змястоўны, цікавы даклад аб жыцці і творчасці Шэўчэнка зрабіў тав. М. Ларчанка. Тав. Клімковіч падзяліўся з слухачамі сваімі ўражаннямі ад паездкі на радзіму вялікага паэта і адказаў на рад пытанняў.

Вечар закончыўся чыткай твораў Шэўчэнка, перакладзеных на беларускую мову.

Ал. Станкевіч.

ШОЛАМ-АЛЭЙХЕМАЎСКІЯ ВЕЧАРЫ Ў БАБРУЙСКУ

Літаратурны гурток пры яўрэйскай цэнтральнай бібліятэцы гор. Бабруйска правёў значную работу па азнаменаванню 80-годдзя з дня нараджэння Шолам-Алэйхема. Гурток абмеркаваў лепшыя творы Шолам-Алэйхема — «Тэв'е-малочнік», «Менахем-Мендл» і іншыя.

Бібліятэкай былі арганізаваны два літаратурныя вечары, прысвечаныя творчас і вялікага яўрэйскага пісьменніка. На апошнім літаратурным вечары, 12 красавіка, рабочы-маляр тав. Несвіжскі напамяць чытаў апавяданні пісьменніка.

Літгуртковцы напісалі вершы, прысвечаныя Шолам-Алэйхему.

Н. Ц. Стэльмак, І. Н. Усаў.

ГАСТРОЛІ РУСКАГА ДРАМТЭАТРА У МЕНСКУ

20 красавіка пастаноўкай «На ўсякага мудраца даволі прастаты» А. Н. Астроўскага пачаў свае гастролі ў Менску Дзяржаўны Рускі драмтэатр БССР. Тэатр прабудзе ў Менску да 25 мая і дасць 30 спектакляў.

У рэпертуары, апрача п'есы Астроўскага, «Васса Жэлезнова» М. Горкага, «Прафесар Палежаеў» Л. Рахманава і «Таня» А. Арбузава.

У першамайскія дні тэатр пакажа прэм'еру «Палаўчанскія сады» Л. Леанава, а ў сярэдзіне мая—прэм'еру «Беднасць не порок» А. Н. Астроўскага.

СЕКЦЫІ ЖЫВАПІСЦАЎ І СКУЛЬПТАРАЎ У САЮЗЕ МАСТАКОЎ

У Саюзе мастакоў БССР адбыліся сходы паасобных груп творчых работнікаў: жывапісцаў і скульптараў. На сходзе былі абмеркаваны планы творчых мерапрыемстваў на бліжэйшы час і створаны секцыі. Старшынёй секцыі жывапісцаў выбран тав. Тарасікаў, намеснікам яго — тав. Ахрэмчык. Старшынёй секцыі скульптараў выбран тав. Бембель.

Сходы секцый графікаў і афарміцеляў-дэкаратараў адбудуцца ў бліжэйшы час.

У ГРУПКОМЕ ССП БССР

Днямі адбыўся справаздачна-перавыбарчы сход профсаюзнай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Работа групкома была падвергнута рэзкай крытыцы і прызнана нездавальняючай. Абран новы склад групкома і рэвізійнай камісіі.

Старшынёй групкома ССП БССР абран тав. Барысаў.

НОВЫ ТЭАТР У ГОМЕЛІ

Увосені 1939 года ў Гомелі будзе арганізаван абласны рускі драмтэатр. Тэатр укамплектоўваецца ў асноўным з студэнтаў-выпускнікоў 4 курса акторскага факультэта Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва ў Маскве, кіруемага народным артыстам СССР Л. М. Леанідавым. Апрача групы выпускнікоў гэтага года ў ліку 23 чалавек, у тэатр уваллецца 10 студэнтаў ранейшых выпускаў інстытута.

У рэпертуары новага тэатра — «Васса Жэлезнова» М. Горкага (рэжысёр спектакля — педагог IV курса Тэатральнага інстытута І. М. Раеўскі), «Рэвізор» Н. Гогаля ў пастаноўцы Л. М. Леанідава (рэжысёр — А. М. Карэў) і інш.

Спектаклі ў Гомельскім рускім драмтэатры пачнуцца пасля летніх канікул.

БУДАЎНІЦТВА КІНОТЭАТРА У БАБРУЙСКУ

На Совецкай вуліцы Бабруйска каля сада імя Чэлюскінцаў будуецца новы кінотэатр на 600 месц. На будаўніцтва асігнавана звыш мільёна рублёў. Тэатр будзе мастацка аформлен. Франтон упрыгожваецца барэльефам на тэму «Чапаеў ля кулямёта», вестыбюль — скульптурай В. І. Леніна.

Будаўніцтва тэатра будзе закончана да 22-й гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

І. Н. Усаў, Н. Ц. Стэльмак.

Хроніка

⊙ Пачатак фестываля калгасна-соўгасных тэатраў БССР перанесен на 18 мая. Да фестываля ў памяшканні Тэатра юнага гледача арганізуецца выстаўка, адлюстроўваючая работу калгасна-соўгасных тэатраў.

⊙ У маі ў БССР прыбывае выстаўка рускага жывапісу XVIII—XIX стагоддзяў і совецкага мастацтва, арганізаваная Дзяржаўным рускім музеем у Ленінградзе. Выстаўка будзе паказана ў Менску і Віцебску.

⊙ Пры полацкім раённым Доме настаўніка створан ансамбль песні і пляскі ў колькасці 50 чалавек. Першы канцэрт ансамбль дасць у першамайскія дні.

⊙ 13 красавіка ў Гомелі адбыўся канцэрт на тэму «Совецкая музычная культура» — з удзелам лаўрэата ўсесаюзнага конкурса выканаўцаў - піяністаў М. Шыхтманам.

⊙ Заліковая экзаменацыйная сесія ў рэспубліканскім тэатральным вучылішчы БССР пачнецца 15 чэрвеня.

⊙ Ансамбль песні і пляскі клуба імя Дзержынскага станцыі Беразіна (Бабруйск) рыхтуе да 1 мая новыя песні — «Аб Варашылаве», «Вінтоўка», «Нас не трогай», «Лянок», плясавыя частушкі і інш. Драмгурток клуба рыхтуе п'есу «Падругі».

⊙ Бабруйская цэнтральная бібліятэка штодзённа выдае чытачам 150—200 кніг. Бібліятэка мае 2500 дарослых чытачоў і 5000 чытачоў—дзяцей. Вялікім попытам карыстаецца абаронная літаратура.

У ДЗЯРЖАЎНЫМ ВЫДАВЕЦТВЕ БССР

СЕКТАР МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ: М. Клімковіч. «Кацярына Жарнасек», драматычная паэма. **П. Панчанка. «Упэўненасць»,** зборнік вершаў. **П. Броўка.** «Кацярына», паэма. **А. Жаўрук.** «Дняпро выходзіць з берагоў», зборнік вершаў. **А. Ушакоў.** «Голас радзімы», зборнік вершаў. **С. Гусеў.** «Шлях юнака», аповесць.

ВЫХОДЗЯЦЬ З ДРУКУ: Я. Колас. Выбраныя творы («Дрыгва», «На прасторах жыцця» і інш.). **Е. Садоўскі.** «Бачу я», апавяданні на рускай мове. **Э. Самуйлёнак.** «Пагібель воўка», п'еса. **«Комсамол на граніцы»,** зборнік. **Альманах рускай секцыі ССПБ.**

ПАДРЫХТАВАНЫ ДА ДРУКУ: М. Багдановіч. «Выбраныя творы». **П. Трус.** «Выбраныя творы». **А. Міронаў.** «Вялікае сэрца», апавяданні на рускай мове з жыцця на Поўначы. **Ус. Краўчанка.** «Калгасныя навелы». **А. Няхай.** «Па сонечных узгорках», зборнік вершаў. **М. Сямашка.** «Шчырасць», вершы. **А. Астрэйка.** «Слава жыццю», зборнік вершаў.

В. В. КУМЕЛЬСКІ

МАЙСТАР СЦЭНЫ

Владзіміра Владзіміравіча Кумельскага я ўпершыню ўбачыў на сцэне 15 год назад. Ішла п'еса «Гувернёр» у тэатры Корша ў Маскве. Прайшла невялікая, але дакучлівая экспазіцыя, і вось на сцэне паяўляецца Владзімір Владзіміравіч у ролі гувернёра. З першых-жа рэплік Владзімір Владзіміравіч захапіў гледача сваім рэдкім абаяннем і бліскуча адточанай манерай весці дыялаг і ўжо не «адпускаў» яго да канца п'есы.

Так размаўляць на сцэне, так авалодваць увагай гледача ўмелі нямногія, і сярод гэтых нямногіх быў Владзімір Владзіміравіч. У майстэрстве весці дыялаг Владзімір Владзіміравіч вельмі паспяхова спаборнічаў з непраўзайдзёным майстрам дыялагу — нябожчыкам Н. М. Радзіным.

Владзімір Владзіміравіч незвычайна лёгка і проста, без усякіх «трамплінаў», адказваў на рэплікі партнёраў. Адсюль — мова яго набывала надзвычайную празрыстасць і лёгкасць. Пры наяўнасці рэдкаснага абаяння, Владзімір Владзіміравіч ствараў шэдэўры, якімі з'яўляліся выконваемыя ім у той час ролі гувернёра і іспанскага двараніна.

Тры годы назад мне пашчасціла іграць з Владзімірам Владзіміравічам у адных п'есах. Гэта былі «Рэвізор» Гогаля і «Бронепоезд 14-69» Вс. Іванова. Больш чулага і ўдзячнага партнёра цяжка сабе ўявіць. Я адчуваў незвычайнае здавальненне, іграючы сцэну Хлестакова з гарадічым — Вл. Вл. Кумельскім. Владзімір Владзіміравіч не вывучаў сістэмы К. С. Станіслаўскага, але «абшчаўся» з партнёрам, «бачыў» і «чуў» партнёра так, як гэта рабілі лепшыя прадстаўнікі школы МХАТ'а.

Выдатная якасць такой «сувязі» з партнёрам заключана ў тым, што актору не патрэбна паўтараць раз і назаўсёды вывучаныя інтанацыі. Ён можа сёння крыху адыйсці ад учарашняга ў той ці іншы бок, не баючыся, што нячулы партнёр не зразумее яго. Адсюль кожная нанава сыграная з ім сцэна была новым творам мастацтва. Яна не страчвала жыцця і не ператваралася ў заштампаваную мёртвую схему.

Калі імкнешся вызначыць амплуа В. В. Кумельскага, дык адразу-ж сустракаешся з цяжкасцю такога вызначэння. Владзімір Владзіміравіч іграў усё. Яму з аднолькавай лёгкасцю ўдаваліся і камедыйныя і драматычныя ролі. У «Рэвізоры» ён сыграў Хлестакова і гараднічага. Ён іграў Нікіту і гувернёра ва «Уладзе цьмы». І, нарэшце, ён іграў Егора Булычова і Целяцева («Шалёныя грошы»). Гэта быў бліскучы рознахарактарны актор, які лёгка пераключаўся з адной ролі ў другую, зусім супрацьлеглую.

Смерць заўчасна вырвала з нашых радоў гэтага бадзёрага, заўсёды вясёлага, мілага чалавека. Як-бы хацелася бачыць Владзіміра Владзіміравіча яшчэ і яшчэ, вучыцца ў яго сакрэту бліскучага вядзення дыялагу, сакрэту майстэрскага авалодання характарам, бачыць вялікі талент майстра, прысвяціўшага 38 год свайго жыцця тэатральнаму мастацтву.

Бывай, мілы Владзімір Владзіміравіч! Памяць аб табе, буйным майстру сцэны, выдатным, рэдкага такту чалавеку, добрым таварышу, не памрэ ў нашых сэрцах ніколі.

Засл. арт. БССР Д. А. ОРЛОЎ.

СПАЧУВАННІ

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР выказвае сваё глыбокае спачуванне калектыву Дзяржаўнага Рускага драматычнага тэатра БССР, сваякам і знаёмым нябожчыка з прычыны заўчаснай смерці таленавітага артыста і рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Владзіміра Владзіміравіча Кумельскага.

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

* *

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР паведамляе аб смерці старэйшага актора Дзяржаўнага Рускага драматычнага тэатра БССР, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР **Владзіміра Владзіміравіча КУМЕЛЬСКАГА** і выказвае сваё глыбокае спачуванне калектыву Рускага тэатра і сям'і нябожчыка.

Упраўленне па справах мастацтваў БССР.

* *

Глыбока смуткуем з прычыны смерці заслужанага дзеяча мастацтваў БССР В. В. Кумельскага.

Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК УССР
КАМПАНІЕЦ.

* *

Калектыў работнікаў Менскага абласнога аддзела мастацтваў і абласнога Дома народнай творчасці выказвае сваё глыбокае спачуванне калектыву Дзяржаўнага Рускага драматычнага тэатра БССР і сям'і нябожчыка з прычыны паспіцішага іх гора—смерці заслужанага дзеяча мастацтваў БССР **Владзіміра Владзіміравіча КУМЕЛЬСКАГА.**

„ГЕНЕРАЛЬНЫ КОНСУЛ“

У МЕНСКІМ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРЫ

Адкрываецца заслона і на сцэне пагранічнікі ў барвістых плашчах псеўдаіспанскага пакрою дэкламіруюць урывак з «Дон Жуана» Пушкіна.

Глядач дзівіцца і не разумее: чаму байцы-пагранічнікі ў такім убранні? Але справа хутка высвятляецца, — байцы рыхтуюцца да пушкінскага паказу, а аўтары п'есы — Шэйнін і бр. Тур забіваюць адным стрэлам двух зайцоў: даюць малюнак культурнага адпачынку пагранічнікаў і, не трацячы часу і энергіі на паказ кахання Гоглідзе і Жукава да Наташы, выкарыстоўваюць для гэтай мэты вершы Пушкіна; арыгінальна і ў плагіяце не абвінаваціш.

Але раптам раздаюцца стрэлы і перад гледачом разгортваецца малюнак таго, аб чым гаворыцца, але не паказваецца ў п'есе Пагодзіна «Падзь сярэбраная» (палон Калкова самураямі), — глядач бачыць байцоў Гоглідзе і Жукава ў японскай разведцы. Затым у справу ўмешваецца совецкі консул Марозаў і пачынаецца сцэнічная ілюстрацыя шмат разоў чытанага намі паведамлення, нарыса, апавядання, нават дыпламатычнай ноты аб совецкім патрыёце, захопленым варожай разведкай.

Нават паказваючы белагвардзейскую зграю («Брацтва рускіх людзей» у Сайрэне), аўтары толькі ў адным месцы ўзнімаюцца над ілюстрацыяй: гэта абурэнне Сімы накіраванымі супроць яе белагвардзейскімі выпадамі (3-я карціна). Гэта месца па-сапраўднаму раскрывае белагвардзейшчыну і мы пазнаем агіднае аблічча колішняй «чорнай сотні».

Мы не перадаем змесцу п'есы, бо ён кожнаму становіцца ясным з таго месца, калі ў справу ўмешваецца консул. (Разведка прымушае байцоў здрадзіць, але байцы непахісны, консул вызваляе байцоў). Гэта законная, жыццём створаная схема распрацавана аўтарамі па-майстэрску лоўка. На працягу васьмі малюнкаў, не пасоўваючы справу ні на крок наперад, аўтары прыкоўваюць увагу гледача да знаёмых падзей. І гледача хвалююць не думкі і пачуцці герояў, а сітуацыі, у якія яны трапляюць. А гэта забяспечвае поспех. І хоць гэты ілюстрацыйны твор напісан вельмі сцэнічна, пры падыходзе да ацэнкі спектакля трэба сказаць толькі, што пастаноўшчык (засл. арт. рэсп. М. А. Зораў) правільна зразумеў змест п'есы, што рэжысёр (тав. Е. С. Рамановіч) здолеў удала пабудаваць мізансцэны, што актор Аляксеенка (лейтэнант Сато) вельмі добра ўсміхаецца і здолеў зрабіць цікавы грым, што засл. арт. рэсп. Грыгоніс (барон Міака) знайшоў вельмі ўдалыя і пераканаўчыя інтанацыі, што засл. арт. рэсп. Рахленка (консул СССР Марозаў) мае вельмі імпазантны выгляд, свабодна і вельмі тактычна вядзе сваю ролю, што засл. арт. рэсп. Ждановіч (Сіма) выглядае вельмі эфектна, шчырая ў сваіх абурэннях...

Так можна пералічыць усіх выканаўцаў, паказаць на тыя ці іншыя адмоўныя ці станоўчыя дэталі ў іх ігры альбо іх вонкавым выглядзе, але ні з адным выканаўцам нельга палемізіраваць у пытаннях трактоўкі таго ці іншага вобраза, у пытаннях разумення таго ці іншага месца п'есы.

Гэта сведчыць аб адсутнасці ў самым творы глыбокай думкі, аб адсутнасці паказу сапраўдных жывых людзей, за кожным словам і рухам якіх хаваюцца пачуцці і думкі. У гэтым творы замест людзей мы бачым гатовыя маскі, выпрацаваныя штампы, якіх нельга іграць добра ці дрэнна; іх можна іграць толькі лоўка і з большым ці меншым майстэрствам. Думаць тут няма аб чым ні пастаноўшчыку, ні актору, ні гледачу. Усё выверана, вымерана да грама, да сантыметра: станоўчым персанажам — пэўная колькасць мужнасці, адданасці, лірыкі і г. д., адмоўным — адпаведныя дозы агіднасці, подласці, правакацыйнай хітрасці і г. д.

Аб такой п'есе і сцэнічнай яе інтэрпрэтацыі можна сказаць толькі адно слова,— правільна, як можна сказаць гэта аб дыяграме ці плакаце. І гэты спектакль — патрэбны, як дыяграма і плакат, але мае мала супольнага з сапраўдным мастацтвам, якое не ілюстрыруе, а раскрывае жыццё, якое не паказвае апрабіраваныя чалавечыя ўчынкі, а раскрывае прыроду іх, якое не ідзе па пратаптаных сцежках, а пракладае новыя шляхі.

Што датычыць афармлення спектакля, якое зрабілі мастакі А. Іваноў і С. Бутлер, то яно пакідае прыемнае ўражанне, зроблена выразна, са значным мастацкім тактам і густам.

Алег СОЖЫН.

У ПАЛЕСКІМ АБЛАСНЫМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ

Совецкі дыпламат на тэрыторыі японскага горада Сайрэна адстойвае інтарэсы соцыялістычнай дзяржавы. Тое-ж робяць захопленыя самураямі ў палон нашы пагранічнікі, не паддаючыся ні на якія правакацыі японскай разведкі. З гэтага выцякае, што п'еса «Генконсул» бр. Тур і Шэйніна апавядае пра маральнае і палітычнае адзінства совецкага народа.

На вялікі жаль, патрыятычная тэма драматургічна распрацавана слаба. Сюжэт п'есы не чоткі, перагружан другараднымі сцэнамі, падзеі ўскрываюцца павярхоўна. Асноўныя персанажы п'есы з'яўляюцца больш носьбітамі пэўных лагічных катэгорый, — чалавечымі асаблівасцямі яны не вылучаюцца.

Малады рэжысёр Ю. Сурыкаў паставіў спектакль проста, без прэтэнзій на стракатую кваціставасць. Але ў пагоні за прастатой рэжысёр не пажадаў нават размежаваць у першай карціне моманты рэпетыцыі драмгуртка і рэальнага прызнання ў каханні паміж камандзірам узвода Гоглідзе, чырвонаармейцам Жукавым і Наташай. Неарганічна ўведзена ў спектакль музыка (кампазітар М. Галін). Яна ў многіх месцах аперэтачная і мала мае дачынення да спектакля. Сцэна ў царкве расцягнута і зніжае тэмп спектакля. Праўда, рэжысёр больш удзяліў увагі акторам, каб стварыць цэльны акторскі ансамбль, і гэта відаць у вобразах совецкіх людзей.

Гоглідзе (арт. Н. Салаўёў), мужны пагранічнік, ярчэй за іншых дзеючых асоб разгорнут у п'есе. Драматургічны матэрыял, хоць і невялікі, усё-ж быў для стварэння цікавай ролі. Актор знайшоў цёплыя лірычныя адценні ў першай сцэне. Добра паказана стойкасць, вытрымансць і непадкупнасць Гоглідзе ў сцэнах у турме, разам з тым добра падкрэслена сіла совецкага чалавека, які ўпэўнен, што совецкі ўрад выратуе яго з драпежных лап японскіх бандытаў.

Цёплы вобраз Жукава (арт. В. Галкін), сведчыць аб сіле гэтага чалавека. У ім актор паказаў чырвонаармейскую дысцыплініраванасць, знаходлівасць, веру ў свае сілы і ў моц совецкага народа, інтарэсы якога ён абараняў не толькі стоячы на граніцы, але і будучы ў палоне.

На вялікі жаль, драматургічны тэкст генеральнага консула Марозава, камендантa консульства Шарафутдзінава і Сімы мала дае акторам матэрыялу для глыбокага ўскрыцця вобразаў. Марозаў (арт. Аляксеенка) гаворыць у п'есе афіцыйнай мовай. Сцэны сустрэчы з прадстаўнікамі японскай улады актор праводзіць удала. Адчуваецца сабранасць, падцягнутасць, спакой Марозава, што падкрэслівае яго перавагу перад працаўнікамі. Сцэны-ж у совецкім консульстве ён вядзе слабей.

Шарафутдзінаў (арт. Кудраўцаў) і яго жонка Сіма (арт. Качынская) пабудаваны: першы — на маўклівасці, другая — на празмернай гаварлівасці. У гэтых рамках цяжка стварыць вобраз. Жаданне актораў «ажывіць» свае ролі ніякага водгуку ў спектаклі не знаходзяць.

Сказваюцца недахопы і ў персанажах японцаў. Аўтары знайшлі толькі нацыянальныя асаблівасці японцаў і толькі ў акцэнце, што робіць гэтых дзеючых асоб аднастайнымі. Праўда, арт. Прушак у ролі японскага агента Сато знайшоў рысы нянавісці да людзей, драпежнай хітрасці, абураючай нахабнасці. Добра створан знешні характар Сато. Але актору неабходна яшчэ працаваць над мовай ролі, дабіваючыся чоткасці дыкцыі і рознастайкасці інтанацый і пазбягаючы лішняга крыку.

Роля губернатара горада Сайрэна арт. А. Лазароўскім не зроблена. На маю думку яе трэба ствараць занава.

У вобразе японскага афіцэра Фуругі арт. Н. Каліненка трэба пазбегнуць утрыроўкі акцэнту. Дарэчы, усім акторам, якія выконваюць ролі японцаў, не варта злоўжываць японскім акцэнтам, гэта трэба рабіць лягчэй і лепш, унікаючы прымітывізму.

Фігура бразільскага консула Сагрэда (арт. В. Міцін) знешне зроблена добра, але актор не знайшоў меры для камічных элементаў і часта пераігрывае, што значна адбіваецца на якасці вобраза.

У белагвардзейцу Кржніцкім (арт. Е. Міліенка) не відаць правакатара. Рысы гэтага прадажнага малойчыка не аб'яднаны ў цэльны вобраз. У Штанге (арт. В. Касуха) адсутнічае літаратурны матэрыял для стварэння вобраза. Гэты персанаж я лічу непатрэбным у п'есе. Ірына (арт. Г. Мелканава) пакуль-што не ўскрыта. Заключная частка гэтага вобраза павінна быць зроблена іначай. Рэжысёру трэба перарабіць мізансцэны Ірыны ў трэцім акце.

Мастацкае афармленне спектакля (мастак А. Сурыкаў) дапамагае раскрыццю рэжысёрскага замыслу пастаноўкі.

Большасць недахопаў спектакля трэба аднесці за лік недапрацаванасці п'есы.

А. ЕСАКОЎ.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Д—1392.